Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№ 74 (28438)

19 КРАСАВІКА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

Дарогі, якія мы рамантуем… МС

Хто куды, а мы на мора — Мінскае МС

Шлях да ідэальнай таліі

СТАР. 15

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Праект дэкрэта «Аб развіцці прадпрымальніцтва і выключэнні залішніх патрабаванняў, што прад'яўляюцца да бізнесу» закліканы кардынальным чынам змяніць існуючую сістэму адносін паміж дзяржавай і бізнесам. Цяпер дзяржава будзе мінімальна ўмешвацца ў работу суб'ектаў гаспадарання. Бізнес будзе сам сябе рэгуляваць. Каб гэтыя словы былі не проста прыгожай фразай, у праекце прадугледжаны шэраг механізмаў па іх выкананні».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.04.2017 г.

Долар ЗША	1,8797	▼
Еўра	2,0008	▼
Рас. руб.	0,0335	▲
Укр. грыўня	0,0700	▼

ISSN 1990 - 763X

ЗРОБЛЕНА З РОЗУМАМ

Без лічбавых тэхналогій зараз немагчыма ўявіць ніводную сферу жыцця. Напрыклад, яшчэ не так даўно высакахуткасны мабільны інтэрнэт або падарожжа ў віртуальную рэальнасць здавалася нечым з разраду фантастыкі, а ўжо сёння адпаведныя прылады робяцца ў прамысловых маштабах. Цікавыя распрацоўкі ў сферы электронікі дэманструюцца на гэтым тыдні на выстаўцы «ТІБО-2017».

Фота Надзеі БУЖАН.

ПЕРШЫ намеснік прэм'ер-міністра Васіль МАЦЮШЭЎСКІ зачытаў падчас урачыстай цырымоніі прывітанне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі гасцям і ўдзельнікам XXIV Міжнароднага спецыялізаванага форуму па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «ТІБО-2017».

— Мерапрыемства ў апошнія гады вельмі маштабнае. Безумоўна, пляцоўка «ТІБО» ў Беларусі карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і ў адпаведных кампаній, і ў нашых калег па ЕАЭС, — падкрэсліў Васіль Мацюшэўскі.

СТАР. 3

■ Ва ўрадзе

Зарплата падрасла

Падведзены вынікі стану эканомікі за першы квартал

Рост рэальнай заработнай платы — 100,5% да студзеня-лютага мінулага года — дасягнуты за кошт павышэння прадукцыйнасці працы. Пра гэта падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў паведаміў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ**.

«У цэлым пастаўленыя ў рамках прагнозу на студзень—сакавік гэтага года задачы выконваюцца. Эканоміка паступова выходзіць з рэцэсіі, валавы ўнутраны прадукт на 0,3% перавысіў узровень мінулага года пры прагнозе, як вы памятаеце, 99,6%. Вырасла і прадукцыйнасць працы па ВУП 100,7% пры прагнозе 99,7%, — адзначыў беларускі прэм'ер. — Станоўчы ўплыў аказаў знешні попыт, які расце: тэмп росту экспарту тавараў і паслуг у студзені-лютым склаў 117,4% да аналагічнага ўзроўню мінулага года. Чыста па таварах экспарт вырас на 19,9%, а без уліку нафты і нафтапрадуктаў і калію — без сыравінных тавараў — тэмп росту склаў 131%. Знешнегандлёвыя патокі збалансаваныя, сальда станоўчае — 56,1 мільёна долараў ці 0,7% да ВУП».

Пры гэтым, па словах кіраўніка ўрада, аднаўленне эканамічнага росту забяспечана без урону для макраэканамічнай стабільнасці. Унутраны валютны рынак функцыянуе стабільна, захоўваецца тэндэнцыя чыстага продажу насельніцтвам валюты. Так, за першы квартал прададзена амаль 500 мільёнаў долараў. Захоўваецца станоўчая дынаміка і па рублёвых дэпазітах насельніцтва: за тры месяцы прыраслі на 6,5% (плюс 192 мільёны рублёў).

Замацоўваецца станоўчая тэндэнцыя і ў асноўных галінах эканомікі. У сакавіку прамысловая вытворчасць прырасла яшчэ на 1,2 працэнтнага пункта. Па выніках студзеня— сакавіка мы выйшлі на ўзровень 104,3% да мінулага года. «З ростам спрацавалі ўсе канцэрны і міністэрствы, за выключэннем, па вядомых прычынах, канцэрна Белнафтахім», — адзначыў Андрэй Кабякоў і дадаў, што пры гэтым ёсць спадзяванне на паляпшэнне сітуацыі «з улікам дасягнутых на мінулым тыдні дамоўленасцяў з расійскімі партнёрамі па газе і нафце». «Важна, што ў эканоміцы выйшлі на рост рэальнай заработнай платы — 100,5% да студзеня-лютага 2016 года. І гэты рост забяспечаны за кошт прадукцыйнасці працы. Меры па збалансаваным росце заработнай платы на ўстаноўлены кіраўніком дзяржавы ўзровень — 1000 рублёў — нараўне са зніжэннем выдаткаў і павышэннем эфектыўнасці ва ўсіх сферах эканомікі дазволяць выйсці на запланаваны ўзровень рэальных існуючых грашовых даходаў насельніцтва», — дадаў прэм'ер-міністр.

«У першым квартале эканоміка выйшла на ўзровень, які запланаваны на першае паўгоддзе: па прагнозе ВУП першага паўгоддзя павінен быць 100,2%», — падсумаваў Андрэй Кабякоў.

Вераніка ПУСТАВІТ.

■ «Звязда» даследуе праблему

«РАСТВАРАЛЬНІК»

Ці патрэбны алкаголікам выратавальны круг?

Яна растварае ўсё — грошы, здароўе, сям'ю... І не трэба думаць, што пад яе ўладу трапляюць толькі слабыя людзі. Ці павернецца язык сказаць пра чэмпіёна свету, што ў яго няма сілы волі? Але і такія співаюцца. Хіба мог бы слабы чалавек уначы без грошай знайсці 100 грамаў? Многія з тых, хто вырваўся з алкагольнай залежнасці, становяцца паспяховымі бізнесменамі альбо пераключаюцца на ўладкаванне свайго побыту, будуюць дамы.

Але ад алкагалізму церпяць не толькі аматары чаркі і іх блізкія. Гэта сур'ёзная эканамічная праблема.

— Спецыялісты падлічылі, што на адзін рубель гарэлкі з цягам часу можа прыпадаць 8 рублёў выдаткаў, бо алкагалізм — гэта траўмы, судзімасці, утрыманне ЛПП. І нават калі чалавек кінуў піць, яго трэба лячыць ад хвароб, прычынай якіх стала злоўжыванне спіртным. А калі па віне мужа алкаголіка яго жонка ўсю ноч не спала, ці будзе на рабоце ад яе эканамічная аддача? — заўважае **старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Цэнтр даверу «Надзея і вылячэнне» Станіслаў КАЎРОЎ**. — У Польшчы я пазнаёміўся з праграмай, якая працуе на вытворчасці. Калі хтосьці са спецыялістаў пачынае выпіваць, з такім чалавекам займаецца кансультант. Каб выхаваць добрага токара, трэба гадоў 10, а звольніць можна за 5 хвілін. Гэта ж эканамічна не выгадна. Лепш яго вылечыць, і няхай працуе і будзе карысным і вытворчасці, і сям'і. Чаму б не паспрабаваць такія метады ў нас? Магчыма, аднаго кансультанта будзе дастаткова на некалькі прадпрыемстваў ці на раён...

— Чаму быць цвярозым і жыць у цвярозасці — розныя рэчы?

— Часам мы кажам: «Паглядзі цвярозымі вачыма». Сапраўды, каб стаць незалежным ад гарэлкі, неабходны цвярозы розум. Так, зрыў у чалавека, які пэўны час устрымліваўся ад алкаголю, пачынаецца не з чаркі, а з думкі пра яе. А падстаў можна знайсці колькі хочаце: званок сябра, добрае надвор'е, дзень нараджэння сабакі, прыгожа аформленыя вінна-гарэлачныя вітрыны, міма якіх чалавек прайшоў. Нават абыякавыя да алкаголю людзі часам прызнаюцца, што, калі бачаць прыгожыя этыкеткі на алкаголі, ім хочацца пакаштаваць яго.

СТАР. 15

Высокатэхналагічныя прадпрыемствы ў аснове

Супрацоўніцтва з Кітаем грунтуецца на самым лепшым. І новым

Дэлегацыя КНР, на чале з адной з ключавых палітычных фігур гэтай дзяржавы — старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Дэцзянам — наведала нашу краіну. Пра важнасць візіту кажа ўжо тое, што ў аэрапорце гасцей віталі абодва спікеры беларускага парламента. А ўчора з прадстаўнікамі Паднябеснай сустрэўся і кіраўнік дзяржавы.

— У год 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі краінамі мы дасягнулі высокай інтэнсіўнасці ўзаемных візітаў, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Сапраўды, літаральна на мінулым тыдні ў Палацы Незалежнасці прайшлі сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з шэрагам грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў КНР: Генеральным пракурорам, міністрам грамадскай бяспекі, сакратаром Камітэта Камуністычнай партыі Кітая правінцыі Хунань.

— Перадайце ад мяне падзяку майму сябру Сі Цзіньпіну за запрашэнне на міжнародны форум «Адзін пояс, адзін шлях», — папрасіў Прэзідэнт. — Упэўнены, ён стане знакавай падзеяй не толькі для Кітая, але і для ўсёй планеты. Беларусь таксама зацікаўлена ў працягу сустрэч на вышэйшым узроўні ў рамках міжнародных фарматаў, такіх як Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва. Актыўныя кантакты чарговы раз падкрэсліваюць асаблівы ўзровень адносін паміж нашымі краінамі: давяральнага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

У маі, дарэчы, плануецца візіт Прэзідэнта Беларусі ў Пекін. Акрамя ўдзелу ў названым міжнародным форуме, запланавана двухбаковая сустрэча са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам.

Кітайская дэлегацыя падчас знаходжання ў нашай краіне правяла шэраг афіцыйных сустрэч.

— Думаю, вы заўважылі, што прыярытэтная ўвага падчас перагавораў удзяляецца пытанням эканамічнага і палітычнага ўзаемадзеяння, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта не дзіўна. Мы чакаем, што высокі ўзровень нашых палітычных адносін падцягне за сабой і эканоміку, перш за ўсё Беларусі — да тых тэмпаў і тых вышынь, якіх дасягнулі вы.

Перагаворы праходзілі ў шчырай, добразычлівай атмасферы. І гэта натуральна, бо ў адносінах дзвюх краін няма праблем. Затое ёсць годныя, высокія мэты, выкананне якіх прынясе карысць і беларускаму, і кітайскаму народу.

Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць некалькі пытанняў двухбаковых адносін:

— Па-першае, далейшае развіццё Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» і, галоўнае, — прыцягненне інвестараў. Мы ствараем магутную інфраструктуру і даём сур'ёзныя прэферэнцыі. Важна, каб усё гэта дало вынік у выглядзе прыходу высокіх тэхналогій, стварэння экспартаарыентаваных вытворчасцяў з гарантаваным рынкам збыту. Хачу звярнуць вашу ўвагу на адну істотную рэч. Падчас наведвання «Вялікага каменя» Старшыня КНР назваў гэта месца жамчужынай Шаўковага шляху. Мы не можам разам з вамі ствараць там прадпрыемствы і эканоміку мінулага. Туды трэба прыцягнуць для работы самыя перадавыя сусветнага ўзроўню кампаніі з эканомікай заўтрашняга дня. У адваротным выпадку прадпрыемствы не змогуць канкурыраваць на еўрапейскіх рынках ды і на рынках постсавецкай прасторы. Мы пра гэта дамаўляліся першапачаткова, і з таварышам Сі Цзіньпінам прытрымліваемся дагэтуль такой палітыкі і практыкі. Таму, пры абмеркаванні гэтых пытанняў у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, у палітбюро, ва ўрадзе, у Парламенце Кітая я вас прасіў бы мець перш за ўсё на ўвазе тое, што ў «Вялікім камені» павінны быць выключна высокатэхналагічныя прадпрыемствы.

«Вялікі камень» — галоўны праект у двухбаковым беларуска-кітайскім супрацоўніцтве. Гэта замысел не толькі гандлёва-эканамічны, інвестыцыйны, а, як пагадзіліся абодва бакі, — стратэгічны палітычны праект. У многім гэта — першы крок да будучых, яшчэ больш маштабных задач. Што да інвестыцыйнага супрацоўніцтва дзвюх краін, то за мінулы год да нас паступіла валавых інвестыцый з Паднябеснай на суму каля 250 мільёнаў долараў.

Па-другое, Прэзідэнт прызнаўся, што яго вельмі турбуе незбалансаванасць двухбаковага гандлю Беларусі і Кітая.

За 2016 год тавараабарот Беларусі і мацерыковага Кітая склаў 2,58 млрд долараў, з іх аб'ём беларускага экспарту — каля 470 мільёнаў долараў, імпарту — 2,11 мільярда. Сальда склалася адмоўнае — у памеры 1,65 млрд долараў.

Трэці кірунак, які прапанаваў абмеркаваць Аляксандр Лукашэнка, — актывізацыя супрацоўніцтва ў фінансавай сферы.

— Беларусь зацікаўлена ў прыцягненні прамых замежных кітайскіх кампаній у банкаўскі сектар. Ёсць папярэднія дамоўленасці па выхадзе China CITIC Bank на беларускі рынак. Зараз патрэбен дазвол кампетэнтных органаў Кітая. Акрамя таго, мы зацікаўлены размясціць беларускія аблігацыі на вашым фінансавым рынку. Неабходны адпаведныя даручэнні для аператыўнага праходжання працэдур у Народным банку Кітая.

Гэта толькі некаторыя кірункі для развіцця двухбаковых адносін:

— Я прасіў нашых кіраўнікоў парламента, каб яны вам у рабочым парадку назвалі яшчэ два-тры пытанні, у якіх мы крайне зацікаўленыя, якія маюць для нас прынцыповае значэнне. І, з другога боку, яны будуць іміджавымі праектамі для Кітайскай Народнай Рэспублікі ў цэнтры Еўропы. Калі вы палічыце неабходным нас у гэтым плане падтрымаць, беларускі народ ніколі гэтага не забудзе і будзе вам вельмі ўдзячны.

Сярод іншых напрамкаў для ўзаемадзеяння беларускі лідар назваў супрацоўніцтва ў турыстычнай сферы.

— Вы самі ўпэўніліся ў прыгажосці Беларусі, — адзначыў ён. — Мы вельмі спадзяемся, што грамадзяне вялікага Кітая знойдуць тут магчымасць адпачыць.

Чжан Дэцзян падзякаваў беларускаму боку за магчымасць наведаць нашу краіну. Па яго словах, Кітай задаволены развіццём двухбаковых адносін з Беларуссю. Пры гэтым дзяржавы падтрымліваюць інтэнсіўныя кантакты на розных узроўнях: ад міжрэгіянальнага да сустрэч на вышэйшым узроўні.

Пасля сустрэчы з кіраўніком дзяржавы для кітайскай дэлегацыі была арганізавана экскурсія па персанальнай выстаўцы пейзажыста Валерыя Шкарубы, якая адкрылася ў Палацы Незалежнасці ў канцы сакавіка.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

❍ У тэму

ЭКАНАМІЧНАЯ СКІРАВАНАСЦЬ

Са старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Дэцзянам сустрэўся і прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй КАБЯКОЎ. Ён нагадаў, што падчас візіту Прэзідэнта Беларусі ў Кітай у 2016 годзе падпісана сумесная дэкларацыя аб усталяванні адносін даверанага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

«Цяпер важна падцягнуць і эканамічныя адносіны да такога высокага ўзроўню супрацоўніцтва, таму прапануем абмеркаваць пытанні эканамічнай накіраванасці, — адзначыў Андрэй Кабякоў. — Для нас гэта асабліва важна напярэдадні візіту ў Кітай Прэзідэнта Беларусі ў маі 2017 года».

Гаворачы пра гэта, прэм'ер-міністр дадаў: «Мы разлічваем, што ў ходзе візіту прасунецца шэраг практычных напрамкаў нашага супрацоўніцтва з Кітаем. Таму разлічваем падчас вашага знаходжання ў Беларусі ў максімальнай ступені падрыхтавацца да гэтага візіту».

ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ ДОБРЫХ СПРАЎ

Плануецца, што сёлета ў рэспубліканскім суботніку, які адбудзецца 22 красавіка, прымуць удзел каля 340 тысяч жыхароў Гродзенскай вобласці, што на 20 тысяч больш, чым летась.

«Мы спадзяёмся пашырыць кола ўдзельнікаў рэспубліканскага суботніка, — паведаміў «Звяздзе» **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ**. — Акрамя рэкламы на транспарце, паўсюдна вывешаны лістоўкі, інфармуем праз СМІ. Лічу, што неабыякавыя жыхары горада і вобласці ў гэты дзень прыбяруць у сваіх дварах, на дзіцячых пляцоўках, у парках...»

Мясцовыя ўлады вызначылі кола работ у кожным раёне вобласці. Так, у Зэльвенскім, Дзятлаўскім і Гродзенскім раёнах асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца памятным месцам. У Ваўкавыскім, Карэліцкім, Слонімскім — працоўны дэсант высадзіцца на тэрыторыі дзіцячых летнікаў. Жыхары Навагрудчыны на суботнік збяруцца ў заказніку «Свіцязянскі».

Вялікі аб'ём работ чакае жыхароў абласнога цэнтра. Гродзенцы навядуць парадак вакол рэчкі Ласасянкі ў мікрараёне Фолюш, высадзяць дрэвы ў мікрараёне Дзвятоўка, правядуць генеральную прыборку ў гарадскіх парках і лясных масівах. Таксама ў гэты дзень пачнецца дэмантаж некаторых будынкаў скуранога завода, які знаходзіцца ў цэнтры горада.

Прагназуецца, што падчас рэспубліканскага суботніка ў вобласці будзе зароблена 680 тысяч рублёў. Палова сродкаў застанецца ў рэгіёне і будзе накіравана на рэканструкцыю і рэстаўрацыю гісторыка-культурнай спадчыны. Акрамя гэтага, частка зароблены на суботніку грошай будзе скарыстана на тэхнічную базу для развіцця творчасці дзяцей і моладзі, падрыхтоўкі да новага сезона дзіцячых летнікаў, а таксама для развіцця інавацыйнай інфраструктуры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Летась асноўны акцэнт быў зроблены на добраўпарадкаванні Аўгустоўскага канала і іншых турыстычных аб'ектаў. Падчас суботніка было зароблена 600 тысяч рублёў, з якіх 300 тысяч засталіся ў рэгіёне. Палова гэтай сумы была накіравана на будаўніцтва мемарыяльнага комплексу памяці ахвяр Першай сусветнай вайны ў Смаргоні. Астатнія пайшлі на добраўпарадкаванне дзіцячых летнікаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ. *margo@zviazda.by*

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует вкладчиков об изменении процентных ставок по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

С 19.05.2017 устанавливается по ранее открытым срочным банковским вкладам в белорусских рублях:

- **«Премиально-накопительный «Детский»**, открытым до 13.11.2015, ставка основных процентов в размере 11,2% годовых;

- **«Накопительный»** (накопительный вклад в национальной валюте с ежемесячной капитализацией; накопительный вклад в белорусских рублях; срочный банковский накопительный вклад в белорусских рублях, а также накопительные вклады, введенные согласно Приказу Государственного банка СССР от 29.03.1990 №30 «О введении новых видов вкладов в учреждениях Сберегательного банка СССР»), процентная ставка в размере 11,2% годовых.

Установленный размер процентов применяется только к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность и автоматическое перезаключение которых на новый срок произошло до 01.04.2016.

С 19.05.2017 устанавливается по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях **«Интернет-депозит-Тренд»:**

- со сроком хранения 36 месяцев, открытым до 05.05.2015 ставка основных процентов при фактическом ежедневном остатке вклада:

до 2000,00 рублей (включительно) – в размере 11,2% годовых;

свыше 2000,00 рублей – в размере 11,7% годовых;

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

С 19.05.2017 устанавливаются по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях, открытым до 19.04.2017, процентные ставки в следующих размерах:

- «Классик Отзывный до года»
на срок 185 дней – 5,2% годовых.

- «Классик Безотзывный до года»
на срок 6 месяцев – 8,7% годовых;
на срок 9 месяцев – 9,7% годовых;
на срок 9 месяцев (в рамках клуба «Бархат») – 10,7% годовых.

- «Свободный выбор»:
на срок 11 месяцев – 12,3% годовых;
на срок 24 месяца – 13,8% годовых.

- «Классик Безотзывный свыше года»:
на срок 18 месяцев – 13% годовых;
на срок 24 месяца – 13,5% годовых.

- «Интернет-депозит-Тренд Отзывный»:
на срок 3 месяца – 6,7% годовых;
на срок 6 месяцев – 8,7% годовых;
на срок 9 месяцев – 9,2% годовых.

- «Интернет-депозит-Тренд Безотзывный»:
на срок 3 месяца – 8,7% годовых;
на срок 6 месяцев – 9,7% годовых;
на срок 9 месяцев – 10,7% годовых;
на срок 9 месяцев (в рамках Клуба «Карт-бланш») – 11,2% годовых;
на срок 9 месяцев (в рамках Клуба #настарт) – 11,2% годовых.

- **«Классик Почтовый Отзывный»** – 8,7% годовых.

- «Классик Почтовый Безотзывный» – 10,7% годовых.

Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Тэрэза Мэй абвясціла датэрміновыя парламенцкія выбары

Кіраўнік брытанскага ўрада Тэрэза Мэй заявіла, што ў Злучаным Каралеўстве 8 чэрвеня пройдуць датэрміновыя парламенцкія выбары, у выніку якіх будзе сфарміраваны новы ўрад. Па словах Мэй, для выхаду з ЕС Брытаніі неабходна моцная ўлада, а апазіцыя ў парламенце рабіла ўсё, каб сарваць падрыхтоўку да брэксіту. Заява прэм'ера стала вялікай нечаканасцю і выклікала гучныя абмеркаванні ў краіне.

Аўстралія ўводзіць новую сістэму выдачы працоўнай візы

Улады Аўстраліі абвясцілі аб узмацненні жорсткасці правілаў выдачы працоўнай візы для замежнікаў. Як паведаміў прэм'ер-міністр краіны Малкальм Тэрнбул, гэта робіцца для таго, каб работадаўцы наймалі больш грамадзян Аўстраліі. «Новая сістэма выдачы віз створана выключна для абароны нацыянальных інтарэсаў», — заявіў кіраўнік урада.

Улады Японіі павялічаць прыём жанчын у войска

Міністр абароны Японіі Тамомі Інада паведаміла аб зняцці абмежаванняў на набор жанчын у разведвальныя падраздзяленні і танкавыя войскі, а таксама аб намеры ў цэлым павялічыць іх прыём у шэрагі сіл самаабароны. Такім чынам, абмежаванні застаюцца толькі для падраздзяленняў радыелагічнай абароны і для падводных лодак, дзе з-за малой прасторы складана забяспечыць жанчынам асобныя каюты.

У М'янме амаль 300 чалавек загінулі падчас воднага фэсту

Правядзенне традыцыйнага воднага фестывалю ў М'янме абярнулася рэзкім ростам гвалту. Па ўсёй краіне было зарэгістравана каля 1200 крымінальных спраў. У выніку ўсіх гэтых злачынстваў 285 чалавек загінулі, 1073 атрымалі раненні. Традыцыйны водны фестываль Ціньянь (Цінджан) працягваўся ў М'янме чатыры дні. Ён з'яўляецца самым важным нацыянальным святам у краіне і папярэднічае наступленню Новага года па бірманскім месяцова-сонечным календары.

ЗРОБЛЕНА З РОЗУМАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Сёлета ў выстаўцы ўдзельнічаюць больш за сто кампаній з 17 краін свету, — зазначыў **міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ**. — Мы імкнуліся прывезці сюды самыя прасунутыя рашэнні ў галіне тэлекамунікацый.

Прыкметная чарга сабралася каля стэнда Міністэрства культуры. З дапамогай шлема віртуальнай рэальнасці кожны ахвотны мог павандраваць па Крэўскім або Гальшанскім замку. І гэта пры тым, што апошні раз зайсці ў сапраўдныя замкі (да таго, як яны ператварыліся ў руіны) можна было больш за сто гадоў таму — яшчэ да Першай сусветнай.

— Мы карысталіся архіўнымі дакументамі, з дапамогай якіх высветлілі, як выглядалі гэтыя будынкі ў XVI—XVIII стагоддзях, — расказвае **прадстаўнік Нацыянальнага гістарычнага музея Алег СВІРЫДОВІЧ.** — Шлем працуе ў камплекце са смартфонам і спецыяльнымі акулярамі. Плануем выкарыстоўваць нашу распрацоўку ў адукацыйных мэтах. Адна справа разглядаць ілюстрацыі ў падручніку і зусім іншая — пахадзіць па самім замку, хай нават і віртуальнай копіі. Плануем стварыць панарамы яшчэ некалькіх замкаў Беларусі.

Каля самага ўваходу ўжо па традыцыі быў усталяваны стэнд Мінгарвыканкама. Сярод іншага, на ім бацькам дэманстравалі, як працуе электронная картка школьніка.

— Ад верасня 2013 года мы паступова ўкараняем яе ў сталічнай сістэме адукацыі, — гаворыць **Наталля САКАЛОВА, начальнік цэнтра інфармацыйных рэсурсаў сістэмы рэгіянальнай адукацыі Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі.** — Спярша яе на ўзбраенне ўзялі 15 школ, і за гэты час далучыліся яшчэ 66. Развіваем праект па двух кірунках. Наша прылада працуе як звычайная плацежная картка, якая прывязваецца да рахунку бацькі, які можа паставіць ліміт расходу грошай. Яна ж служыць пропускам у школу, дазваляе аўтаматызаваць працу бібліятэкі, заплаціць за харчаванне, замяняе даведку аб навучанні, якая дае права на бясплатны праезд. Дзякуючы карткам дзейнічае і анлайн-сэрвіс «Электронны дзённік». Яго выкарыстоўваюць 38 школ Мінска. Пастаўленую адзнаку школьніку яго бацькі могуць адразу пабачыць, бо на тэлефон прыйдзе адпаведнае паведамленне. Вось так навучальны працэс становіцца адкрытым.

Фота Надзеі БУЖАН.

Сваю апошнюю распрацоўку прадэманстраваў і холдынг «Гарызонт». Гэта 65-цалёвая сэнсарная сістэма H-BOARD з 4K-разрозненнем. Велізарная «разумная» дошка можа выкарыстоўвацца ў адукацыйных установах ці падчас правядзення прэзентацый. Але разам з тым яна можа працаваць і ў рэжыме звычайнага тэлевізара або планшэта. Кіруецца гаджэт дзвюма аперацыйнымі сістэмамі.

Айчынныя арганізацыі прапаноўвалі і не менш цікавыя прылады для дома.

— Наша сістэма хатняга відэаназірання працуе пры дапамозе wi-fi, — кажа прадстаўнік адной з кампаній Уладзіслаў. — Мантаж яе вельмі просты і не патрабуе значных капіталаўкладанняў. З дапамогай праграмы для смартфона можна ў любы момант паглядзець, што адбываецца ў полі зроку камеры, або запісаць відэа ў архіў. Ці зрабіць фотапастку — скажам, нехта адчыніў дзверы, а на ваш тэлефон тут жа прыйдзе адпаведнае паведамленне і здымак наведніка. Камеры працуюць у HD-якасці.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

■ Святло

ДЫЯЛОГІ ДАБРЫНІ І МІЛАСЭРНАСЦІ

Першы маладзёжны міжканфесійны фестываль-выстаўка «Велікодны куліч» сабраў валанцёраў БРСМ «Добрае Сэрца» з усіх рэгіёнаў краіны

Конкурс на найлепшую велікодную кампазіцыю і пісанку, індывідуальныя майстар-класы па іх вырабе, прэзентацыя творчых фотаработ, малюнкаў дзяцей і моладзі, а таксама дэгустацыя кулічоў — велікодны тыдзень у Храме-помніку ў гонар Усіх Святых набыў асаблівую святочнасць.

Аб тым, што Хрыстос Уваскрос, выпадковаму спадарожніку цяпер будуць нагадваць і восем упрыгожаных святочнымі пісанкамі «велікодных дрэў», высаджаных каля храма. Гэтым самым падлеткі, а таксама прадстаўнікі духавенства і дэпутацкага корпуса далучыліся да кансалідацыі намаганняў па захаванні сапраўдных хрысціянскіх каштоўнасцяў, папулярызацыі традыцый хрысціянскай міласэрнасці і дабрачыннасці, духоўна-маральнай асветы.

— У свае маладыя гады, калі мне давялося несці паслушэнства ў Іерусаліме, мы таксама саджалі дрэвы, — згадаў **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.** — Здаецца, нічога незвычайнага, але гэта мае надзвычай важнае і палітычнае, і педагагічнае ўздзеянне на душу кожнага чалавека, прывязвае, аб'ядноўвае людзей. Сёння, калі ўсё часцей падымаюцца пытанні аб экалогіі, я заўсёды кажу: прыязджайце ў Беларусь і паглядзіце, як трэба любіць Радзіму, сваю зямлю.

Епіскап Мінска-Магілёўскай архіепархіі Юрый КАСАБУЦКІ лічыць вельмі важным, калі сучасная моладзь далучаецца да агульнай спадчыны. «Спадчына, якую мы атрымалі ад нашых продкаў, — гэта той скарб, які нам трэба захаваць і пераказаць іншым пакаленням, — перакананы епіскап. — Калі наша моладзь удзельнічае ў такіх велікодных мерапрыемствах, цікавіцца і сваімі рукамі спрабуе нешта зрабіць, гэта сапраўды добрая справа».

Па словах **члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Андрэя БЕЛЯКОВА**, фестываль-выстаўка «Велікодны куліч» праводзіцца ўжо пяты раз, але ўпершыню — на міжканфесійным узроўні. «Тысячы зерняў, якія мы калісьці закладвалі ў зямлю, праводзячы першы фестываль, сёння ўжо прынеслі плён, — адзначыў першы сакратар Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. — Мноства падлеткаў па ўсёй краіне добраўпарадкоўваюць помнікі і храмы, аднаўляюць духоўную спадчыну. Сёння мы аб'ядноўваемся, каб ствараць, развіваць, будаваць нашу Беларусь».

Адным з ключавых мерапрыемстваў фестывалю-выстаўкі стаў міжканфесійны «Адкрыты дыялог». Прадстаўнікі духавенства, а таксама дэпутацкага корпуса ў фармаце чаявання адказалі на пытанні, якія хвалююць сучасную моладзь.

— Наша краіна ніколі не была монаканфесійнай, — падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК**, адзначыўшы, што мы прысутнічаем пры адраджэнні надзвычай даўняй беларускай традыцыі, калі ў XVI стагоддзі за адным сталом на Вялікдзень побач сядзелі праваслаўныя, каталікі і нават пратэстанты. — Перад выклікамі бязбожнага глабальнага свету захаванне традыцый, фундаментальных паняццяў дабра і зла, разуменне маральнага выбару, таго, што ў чалавека акрамя правоў ёсць яшчэ і абавязкі, і тое, што без любові і міласэрнасці няма чалавека, — вось пра што мы павінны памятаць заўсёды.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

■ Класныя навіны

Асабісты кабінет — для будучых ліцэістаў

У Ліцэі Белдзяржуніверсітэта распачаўся прыём дакументаў. Яны будуць прымацца да 6 мая ўключна.

Новаўвядзеннем сёлетняй прыёмнай кампаніі стане прыём дакументаў у анлайн-рэжыме праз «асабісты кабінет абітурыента» http://www.liceum.bsu.by/abiturientu.html. З дапамогай гэтага электроннага рэсурсу старшакласнікі змогуць зарэгістравацца для ўдзелу ва ўступных выпрабаваннях, азнаёміцца з раскладам экзаменаў, а таксама даведацца пра іх вынікі. Ну а для абітурыентаў з аддаленых рэгіёнаў краіны гэта яшчэ і цудоўная магчымасць падаць дакументы, не выходзячы з дома.

Залічэнне ў 10-я класы ліцэя будзе ажыццяўляцца па выніках двух пісьмовых уступных іспытаў, якія пройдуць 14 і 21 мая. Рэзервовы дзень — 27 мая.

Усяго ў 2017/2018 навучальным годзе ў ліцэі плануецца сфарміраваць 12 класаў па 22 чалавекі: па два — матэматычныя, фізічныя, біялагічныя, філалагічныя, гісторыка-грамадазнаўчыя і па адным — хімічным і інфарматыка-матэматычным.

Без уступных іспытаў у Ліцэй БДУ залічваюцца пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды (уладальнікі дыпломаў I, II або III ступені) па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі, гісторыі, грамадазнаўстве, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры і англійскай мове.

У папярэдні год агульны конкурс у Ліцэй БДУ склаў 7 чалавек на месца. Самы высокі конкурс (11,8 чалавека на месца) утварыўся на рускім філалагічным кірунку. А найбольшая колькасць заяў ад абітурыентаў паступіла на хіміка-біялагічны профіль — 363. На адно месца тут было зарэгістравана 9,4 прэтэндэнта.

Прахадны бал на філалагічны кірунак (руская—англійская мова) склаў 123, на хіміка-матэматычны і фізічны — 132, хіміка-біялагічны — 131, філалагічны (беларуская мова) — 125, прыкладную інфарматыку — 130, матэматычны — 119, гісторыка-грамадазнаўчы — 114. Стаць ліцэістамі пажадалі 32 пераможцы рэспубліканскіх прадметных алімпіяд.

Між іншым, да канца красавіка на серверы дыстанцыйнага навучання для абітурыентаў Ліцэя БДУ http://www.liceum.bsu.by/abiturientu/repetitsionnie-vstupitelnie-ispitaniya.html арганізаваны бясплатныя рэпетыцыйныя экзамены.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПАДАРУНКІ ДЛЯ МАЛАМАЁМНЫХ

Вялікі гуманітарны груз атрымала ў гэтыя велікодныя дні магілёўская хрысціянская дабрачынная арганізацыя «Табея». Пасылку агульнай вагой сто тон прыслала ёй каталіцкая арганізацыя «Дзеці ў бядзе» з нямецкага горада Фрэдэна. У спісе — медыцынскія ложкі, інвалідныя каляскі, бытавая тэхніка, веласіпеды, іншы спартыўны інвентар, а таксама дзіцячая мэбля, адзенне, абутак, цацкі.

— У гэтай доўгатэрміновай акцыі ўдзельнічала ўсё насельніцтва Фрэдэна, — падкрэсліў кіраўнік дэлегацыі Губерт Ліхцэнберг.

Сяброўства паміж арганізацыямі пачалося 30 гадоў таму, калі жыхары нямецкага горада ўпершыню прынялі на аздараўленне беларускіх дзяцей. Менавіта тады і прыйшла ідэя з перадачай гуманітарнай дапамогі. Чарговы груз паступіць у раённыя цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва, таварыствы інвалідаў, бальніцы і непасрэдна людзям, якія жывуць у нястачы.

— Гэта супрацоўніцтва можна лічыць сапраўднай «народнай дыпламатыяй», — адзначыў кіраўнік магілёўскага аддзялення міжнароднай арганізацыі «Табея» Павел Бродаў. — Яно грунтуецца на такіх паняццях, як дабрыня і спагадлівасць.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

МАРШРУТКА ЗАГАРЭЛАСЯ ПАДЧАС РУХУ

Здарэнне мела месца а палове дзявятай раніцы ў сталіцы па вуліцы Сурганава.

Падчас руху аўтамабіля «Мерседэс-Спрынтар» 2009 года выпуску ў маторным адсеку адбылося загаранне. У гэты момант у салоне знаходзілася 15 пасажыраў, ніхто з якіх не пацярпеў. Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, прычына пажару ўстанаўліваецца. Нягледзячы на намаганні кіроўцаў, якія спыніліся побач з маршруткай і выкарыстоўвалі свае аўтамабільныя вогнетушыцелі, ліквідаваць гарэнне ў іх не атрымалася. Аднак яны змаглі збіць полымя і не дапусціць далейшага распаўсюджвання агня па салоне аўтамабіля да прыезду ратавальнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

КІЛАМЕТРОВЫ АСТЭРОІД ПРАЛЯЦІЦЬ ПОБАЧ

Да Зямлі рухаецца гіганцкі астэроід 2014 JO25, а ноччу з серады на чацвер ён наблізіцца да нашай планеты на максімальна блізкую адлегласць за апошнія 400 гадоў. Аб гэтым паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на анлайн-абсерваторыю Slooh.

Гэта нябеснае цела было адкрыта ў 2014 годзе з дапамогай аўтаматызаванага тэлескопа ў ЗША. Па розных ацэнках, яго дыяметр можа складаць ад 640 метраў да 1,5 кіламетра. Навукоўцы паведамляюць, што касмічны аб'ект праляціць на адлегласці ў 1,77 мільёна кіламетраў ад Зямлі, а хуткасць палёту астэроіда складае каля 33 м/с.

Спецыялісты таксама падкрэсліваюць, што паверхня 2014 JO25 у два разы мацней адлюстроўвае сонечнае святло, чым паверхня Месяца. Таму за палётам касмічнага цела можна будзе назіраць з Зямлі ў аматарскія тэлескопы ці нават простым вокам.

Разам з тым астраномы запэўніваюць, што Зямлі нічога не пагражае, бо траекторыя палёту гэтага астэроіда не перасякаецца з яе арбітай. На іх думку, ён наўрад ці калі-небудзь сутыкнецца з Зямлёй. Але абсалютнай упэўненасці ў гэтым, вядома, няма — у космасе ўсякае бывае. Гэты астэроід, напрыклад, рэгулярна збліжаецца з Венерай і Меркурыем. Хто ведае, як паўплывае прыцягненне гэтых планет на траекторыю яго палёту. Падлічана, што ў 2091 годзе астэроід 2014 JO25 зноў апынецца вельмі блізка ад нашай планеты. Але наколькі блізка, пакуль можна толькі гадаць. Пачакаем...

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

НА ЧУЖЫМ АЎТО І БЕЗ ПРАВОЎ ЗБІЛА ДЗІЦЯ

Пра што толькі думаюць людзі, калі здзяйсняюць падобныя ўчынкі? 21-гадовая кабрынчанка, якая ніколі не мела правоў на кіраванне аўтамабілем, села за руль машыны, якая належыць грамадзянцы Расіі, і паехала катаць гасцей па Кобрыне. Справа была ўвечары. Гаравадзіцель не справілася з кіраваннем, выехала на сустрэчную паласу, а потым і на тратуар, дзе, на бяду, знаходзілася 15-гадовая дзяўчынка. Яна была літаральна прыціснутай да бетоннай канструкцыі клумбы. Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкай абласной ДАІ, пацярпелая дастаўлена ў рэанімацыю раённай бальніцы.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Ініцыятыва

ПАДТРЫМАЦЬ ГАСПАДАРСКІ АЗАРТ

Яўген Гермаш — чалавек ініцыятыўны. У яго шэраг ідэй, якія ён хацеў бы ўкараніць у жыццё. Большасць з іх датычацца земляробства, а дакладней — вытворчасці агародніны, з даходаў ад якой і жыве сям'я. Пра такіх людзей кажуць, што яны піянеры, гэта значыць першыя спрабуюць нешта новае. Многія іх ідэі з'яўляюцца прыкладам для іншых, даюць старт новым адкрыццям і інавацыям, што накіраваны на паляпшэнне якасці жыцця.

Яўген разам з жонкай Алай займаюцца вырошчваннем разнастайных культур, але перавагу аддаюць агуркам і капусце. У большай ступені менавіта для агуркоў ён паставіў сёлета металакаркасную цяпліцу на пяць сотак. Будаўніцтва цяпліцы — гэта рэалізацыя сумеснай ініцыятывы Яўгена і яшчэ некалькіх уладальнікаў прысядзібных гаспадарак, якая падтрымана Цэнтрам сельскага развіцця з дапамогай сродкаў праекта «Сетка агароднікаў Століншчыны (ExNet)».

— Некалі бачыў такія цяпліцы ў Мелітопальскім раёне Запарожскай вобласці Украіны, — расказвае Яўген Гермаш. — Для такой канструкцыі, як у мяне, лепш выкарыстоўваць плёнку шырынёй 16 метраў, каб не клеіць. Сёлета гэтую плёнку заказвалі з Польшчы праз Цэнтр сельскага развіцця. Як яна сябе пакажа, ці прастаіць як мінімум тры сезоны, — паглядзім. Але менавіта на гэта спадзяванні.

Вышыня цяпліцы 4,5 метра, шырыня — 10 метраў. Вялікія памеры адразу ставяць перад пытаннем: як яе накрыць? Ды і сама металічная канструкцыя, па якой, здаецца, складана хадзіць, таксама прымушае задумацца... Мае апасенні аказаліся дарэмнымі. Крыць цяпліцу не так і складана. Мы прывыклі, што драўляныя канструкцыі парнікоў ніжэйшыя. Але ж на іх цяжэй нацягваць плёнку, — яна чапляецца за драўніну, яе трэба прыбіваць. А тут, дзякуючы авальнай форме канструкцыі, плёнка сама ахінае парнік. Патрэбен толькі спрытны чалавек, які залезе на канёк і будзе яе цягнуць.

У адным з парнікоў летась ён зманціраваў сістэму вадзянога ацяплення, а ў гэтым годзе эксперымент прадоўжаны, у сістэму дабаўляюцца цеплавентылятары.

Металакаркасная цяпліца — першая такая ў вёсцы. Але гэта далёка не адзіны эксперымент, рэалізаваны Яўгенам Гермашам. У 2011 годзе ён таксама першы ў сваёй вёсцы пачаў «грэць зямлю» — правёў вадзяное ацяпленне пад глебай. Яму вельмі спадабалася, нягледзячы на тое, што ў драўлянай цяпліцы штогод даводзіцца на зіму яго даставаць, а на вясну класці назад, каб не папсаваліся трубы. Яўген увогуле спрабуе ўдасканаліць сістэму ацяплення, таму што падаграванне паветра ў парніках з дапамогай «печак-буржуек» затратнае па расходзе дроў, а таксама патрабуе вельмі шмат часу на догляд ноччу. У адным з парнікоў летась ён зманціраваў сістэму вадзянога ацяплення, а ў гэтым годзе эксперымент прадоўжаны, у сістэму дабаўляюцца цеплавентылятары. Ідэю Яўген «падгледзеў» у Століне ў чалавека, які прымяняе такое абсталяванне для абагрэву вытворчага памяшкання.

У цяпліцы Яўгена стаіць вялізны кацёл, ад якога гарачая вада паступае па ўсіх трубах ацяплення. Ён мае дзве помпы. Звечара гаспадар падагрэе грунт, а потым выключае падглебавае ацяпленне. Дзякуючы цёплай зямлі агурок добра развіваецца і менш хварэе.

Яшчэ на сваім участку Яўген Гермаш эксперыментаваў з вырошчваннем капусты брокалі ў другім севазвароце. (Гэты эксперымент таксама падтрыманы са сродкаў праекта.) Высяваў насенне ў канцы ліпеня безрасадным спосабам, і вынікам застаўся вельмі задаволены. Летась у яго пад гэты новы від капусты было адведзена 2,5 сотак. Вырошчваць спадабалася. Апрацоўка, паліў і праполка — без цяжкасцяў. Толькі трэба сачыць, каб своечасова зразаць галоўкі, якія ў гэтай расліны вельмі хутка зацвітаюць. Гаспадар рэалізоўваў брокалі самастойна. У асноўным вывозіў на восеньскія кірмашы.

Сёння збоку ад металакаркаснай цяпліцы стаіць новы магутны кацёл на 120—130 КВт. Ацяпленне плануецца весці пад зямлёю і па перыметры. Пад глебай ужо ляжаць пластыкавыя трубы.

Яўген з азартам расказвае пра выкарыстанне для накрыцця цяпліц двайной плёнкі, паміж слаямі якой запампоўваецца цёплае паветра. Тэхналогіі, якія дазваляюць эканоміць цяпло, ён таксама бачыў ва Украіне.

...У час майго наведвання сядзібы Гермашаў там кіпела работа. Яўген займаўся мантажом ацяплення. Большую частку работы па ўстаноўцы металакаркаснай цяпліцы рабіў самастойна. Як практычна і ўсю работу ў цяпліцах і ў полі. Сям'я Гермашаў імкнецца заўсёды абыходзіцца сваімі сіламі.

Таццяна СЕГЕН

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

строительства объекта «Строительство группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной». Дом №1 по генплану (2-я очередь строительства)

Информация о застройщике: «Приорбанк» Открытое акционерное общество («Приорбанк» ОАО), зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь 12 июля 1991 г., регистрационный номер 12.

Юридический адрес и местонахождение: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 12.30 до 13.15, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

В течение трех предшествующих лет «Приорбанк» ОАО как заказчик принял участие в строительстве следующих объектов недвижимости:

в 2015 году – «многоквартирный жилой дом №2 по генплану в составе объекта «Строительство группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш – Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной» 1 очередь строительства, г. Минск.

Информация об объекте строительства.

Цель строительства: исполнение условий заключенного с Минским городским исполнительным комитетом договора от 12 октября 2009 г. №258-Д на реализацию права проектирования и строительства группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

Этапы и сроки реализации объекта строительства: первый пусковой комплекс строительства – жилая часть здания (секция 5, 6, 7, 8) без чистовой отделки, места общего пользования и инженерные помещения технического подполья, технические этажи секций 5, 6, 7, 8, а также помещение товарищества собственников с чистовой отделкой; второй пусковой комплекс строительства – жилая часть здания (секции 1, 2, 3, 4) без чистовой отделки, встроенные помещения (секция 1-8) без чистовой отделки общей площадью 2734,87 квадратного метра, места общего пользования и технические этажи (секции 1, 2, 3, 4) с чистовой отделкой, пристроенная подземная гараж-стоянка с внутренней и наружной отделкой и внутренними инженерными сетями: водоснабжения, ливневой и хозбытовой канализации, отопления, вентиляции, дымоудаления, электроснабжения, освещения, пожаротушения, пожарной сигнализации и оповещения о пожаре, с помещениями двойного назначения, защитными укрытиями общей площадью 6328,54 квадратного метра.

Первый пусковой комплекс строительства: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – июнь 2016 г. (введен в эксплуатацию).

Второй пусковой комплекс строительства: начало строительства – 9 февраля 2015 г., окончание строительства – июнь 2017 г.

Государственная экспертиза проектной документации: экспертные заключения от 6 августа 2010 г. №895-15/10 и от 4 февраля 2015 г. №67-15/15, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

Разрешение на производство строительно-монтажных работ: разрешение на производство строительно-монтажных работ от 30 декабря 2016 г. №2-207Ж-001/15, выданное инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску.

Местонахождение объекта строительства: г. Минск, Советский район, в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

Характеристика объекта строительства: жилой дом состоит из 8 жилых секций, из которых 1, 5, 8 – 10-этажные и 2, 3, 4, 6, 7, 12-этажные. Конструктивная схема здания – монолитный каркас с шагами колонн от 2,3 м до 7,2 м со сплошными плоскими монолитными перекрытиями толщиной 200 мм. Здание с теплым техническим чердаком и техническими надстройками, в которых расположены машинные помещения лифтов и венткамеры подпора воздуха. Под домом запроектировано техническое подполье, в котором размещаются тепловые пункты, насосная пожаротушения, ЛВС. Техподполье имеет три самостоятельных выхода. Высота технического подполья 2,3 м обусловлена возможностью подключения здания к наружным сетям. Общая площадь квартир: однокомнатных от 43,15 до 54,09 кв. м; двухкомнатных от 63,51 до 78,39 кв. м; трехкомнатных от 83,48 до 100,02 кв. м Количество квартир на этаже – 4. Высота жилого этажа от пола до пола 3 м. Во всех квартирах запроектировано устройство летних помещений (остекленных лоджий и балконов). В квартирах, расположенных на 6 этаже и выше, в качестве второго эвакуационного выхода приняты выходы на лоджии и балконы с глухими простенками шириной 1,2 м. На 1-м этаже расположены встроенные административно-торговые помещения 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 общей площадью 2734,87 квадратного метра с входами со стороны основных транспортных и пешеходных потоков. Для маломобильной группы населения при входах в эти помещения предусматриваются пандусы. Входы в жилье осуществляются со стороны дворовой территории. На первом этаже 8 секции предусмотрены помещения товарищества собственников. Естественное освещение обеспечивается нормативным удалением дома от прилегающей застройки с учетом инсоляции, а также оптимальным соотношением площадей окон к площадям помещений. Дом оборудован лифтами, мусоропроводом. Кровля плоская с внутренним водостоком. Окна – из ПВХ профиля с двухкамерными стеклопакетами. Под дворовой территорией предусмотрено размещение подземного одноэтажного гаража-стоянки на 181 машино-место. Объемно-планировочное решение гаража-стоянки предусматривает устройство двух отсеков на 91 и 90 машино-места, разделенные противопожарной преградой с тамбур-шлюзом между ними. Каждый отсек имеет два выезда – один непосредственно наружу, второй – через соседний отсек. Выходы для людей предусмотрены через лестничные клетки и по въездным пандусам. В жилом доме предусмотрена аварийная противодымная вентиляция для удаления дыма при пожаре из коридоров и подача наружного воздуха из шахты лифтов. Вентиляция: в квартирах – естественная; во встроенных помещениях – естественная и механическая. Электроснабжение: разводка электропроводки с установкой электросчетчиков по квартирам и встроенным помещениям. Холодное и горячее водоснабжение: в квартиры и встроенные помещения устанавливаются счетчики холодной и горячей воды, регуляторы давления и устройства пожаротушения. Отопление: в квартирах – двухтрубная система отопления с установкой радиаторов и счетчиков учета тепла для каждой квартиры; во встроенных помещениях – горизонтальная однотрубная система отопления с установкой радиаторов и теплосчетчиков для каждой организации, потребляющей тепло. Телефонизация, радиофикация, телевидение: поквартирная разводка. Внутренняя отделка только мест общего пользования (общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы). Внутренняя отделка жилых помещений и встроенных помещений: стены, потолки, полы — без чистовой отделки. Дверные блоки: наружные – металлические; межквартирные – деревянные; межкомнатные – не устанавливаются.

Количество предлагаемых объектов долевого строительства: второй пусковой комплекс строительства – 20 единиц; 10 машино-мест.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц следующие квартиры второго пускового комплекса строительства: двухкомнатные квартиры – 10 единиц; трехкомнатные квартиры – 10 единиц.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан и юридических лиц 10 машино-мест.

Цены на объекты долевого строительства:

второй пусковой комплекс строительства: Стоимость 1 (одного) квадратного метра **двухкомнатных, трехкомнатных** квартир при внесении 100% оплаты в течение месяца с момента заключения договора составляет **2 100** (две тысячи сто) белорусских рублей.

Стоимость 1 (одного) машино-места составляет **30 000** (тридцать тысяч) белорусских рублей. Первоначальный взнос – 20%. Оставшиеся платежи равными частями не позднее июня 2017 г.

Формирование стоимости квадратного метра вышеназванных квартир производится на основании сводного сметного расчета с учетом затрат застройщика.

Условия оплаты: при заключении договора дольщик вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров, на момент заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата для всех категорий участников долевого строительства составляет 100% от стоимости квартиры (цены договора) и должна быть внесена не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Первоначальный взнос для всех дольщиков составляет не менее 20% от стоимости машино-места (цены договора) и должен быть внесен не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора создания объекта долевого строительства. Оплата по договорам создания объекта долевого строительства будет осуществляться в белорусских рублях.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Права застройщика на земельный участок: решение Минского городского исполнительного комитета от 4 декабря 2014 г. №3079 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства объекта». Свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на него от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7546; от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7547; от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7548; от 18 декабря 2014 г. №500/1109-7550.

Площадь и границы земельного участка: земельный участок площадью – 2.2393 га, расположен в квартале улиц Корш-Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

Элементы благоустройства: Комплекс работ по благоустройству включает устройство подъездов, пешеходных связей, установку малых архитектурных форм, озеленение, организацию детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок, площадок для отдыха взрослых.

Количество в строящемся объекте строительства самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после ввода объекта строительства в эксплуатацию: общее количество квартир – 327, в том числе: однокомнатные – 54 единицы; двухкомнатные – 128 единиц; трехкомнатные – 145 единиц. Общее количество встроенных общественно-торговых помещений – 11 единиц. Общее количество машино-мест – 181 единица.

Общее имущество объекта строительства, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта строительства в эксплуатацию и передачи объектов долевого строительства дольщикам: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и вентиляционные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, сантехническое, электрическое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их деятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в собственность дольщиков, если финансирование этих объектов осуществлялось дольщиками, и передаются застройщиком товариществу собственников.

Предполагаемый срок ввода объекта строительства в эксплуатацию: окончание строительства – 30 июня 2017 г.

Договор строительного подряда: договор строительного подряда от 29 декабря 2014 г. №03.01-05/7 заключен застройщиком с ОАО «Стройтрест №35».

Условия приема заявлений и ознакомления с объектом долевого строительства: прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3. Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик вправе заключить договор с другим претендентом. Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя застройщика – Общество с ограниченной ответственностью «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» (ООО «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс»), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Л. Беды, 10, пом. 1Н, каб. 3 или по телефону: 8 (017) 292 42 19.

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
✓ Оценка всех видов собственности

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА СВЕТЛОГОРСКОГО РАЙПО, 8 (02342) 2 14 34

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	– Капитальное строение (здание неустановленного назначения) с инв. №342/С-168246, общей площадью – 204,0 кв. м (составные части и принадлежности: пристройка и тамбур кирпичные), расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Авиационная, 2А/4. – Капитальное строение (здание неустановленного назначения) с инв. №342/С-168266, общей площадью – 18,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Авиационная, 2А/8. – Капитальное строение (здание неустановленного назначения) с инв. №342/С-168268, общей площадью – 281,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Авиационная, 2А/5. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 325050100001002589 площадью 0,7956 га	115 209,00	**11 520,90**

Срок подачи заявления	По 28 апреля 2017 г. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**29 апреля 2017 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 19.04.2017 г.
Условия продажи	Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона. Срок оплаты: определяется по согласованию с собственником имущества при заключении договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2017 г.

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

19 красавіка 2017 г.
№ 13 (397)

Патрэбна дарога, але не дорага
стар. 3

Была школа — стала крама
стар. 7

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

АРТЭРЫІ ДЗЯРЖАЎНАГА ЗНАЧЭННЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёлета з рэспубліканскага фонду і рэгіянальных бюджэтаў на паляпшэнне мясцовых дарог накіруюць каля 120 млн рублёў

У першай дэкадзе красавіка кіраўнік дзяржавы ўзняў пытанне якасці і рамонту магістраляў раённага маштабу і сельскіх дарог. Работы плануюцца грунтоўныя, бо ступень зносу палатна вялікая.

Сапраўды наша краіна мае дастаткова развітую сетку аўтамабільных дарог агульнага карыстання. Іх працягласць складае 71 тысячу кіламетраў. Мясцовыя дарогі ў Беларусі звязваюць паміж сабой 23 тысячы населеных пунктаў, у тым ліку 199 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, каля 1,4 тысячы аграгарадкоў, 21,8 тысячы вёсак і сельскіх населеных пунктаў. Нельга не ўлічваць пад'езды да прамысловых, сельскагаспадарчых аб'ектаў. Зразумела, усе гэтыя дарогі час ад часу патрабуюць рамонту, ад элементарнага ямачнага да капітальнага.

Дарэчы, шчыльнасць дарожнай сеткі ў Беларусі самая высокая сярод краін СНД. У свеце пакуль па гэтым паказчыку лідзіруюць Бельгія, Нідэрланды і Германія. А ў нас ёсць два трансеўрапейскія калідоры, Захад — Усход і Поўнач — Поўдзень, якія звязваюць Расію і Еўрасаюз, Фінляндыю, Літву, Малдову, Румынію, Балгарыю і г. д. Сёння мы не проста транзітная дзяржава, а з нядаўняга часу яшчэ і важнае звяно праекта новага Шаўковага шляху.

Так адбылося, што апошнім часам удзяляецца вялікая ўвага развіццю сеткі рэспубліканскіх аўтамагістраляў краіны, а пытанні мясцовых дарог адышлі на другі план. Гэта прывяло да з'яўлення справядлівых нараканняў з боку насельніцтва на стан дарожнай сеткі ў рэгіёнах. Па розных ацэнках, ад шасці да дзесяці тысяч кіламетраў дарог патрабуюць неадкладнага рамонту. Міністэрства транспарту падлічыла, што кожны 8-ы кіламетр мясцовых дарог знаходзіцца ў дрэнным стане, а калі пакрыццё не аднаўляць своечасова, то выдаткі на рамонт ўзрастуць у 2,5—3 разы. Спецыялісты адзначаюць, што каля 80% такіх трас выкарыстоўваюцца з пратэрмінаванымі рамонтнымі тэрмінамі. Амаль палова з іх капітальна не рамантавалася на працягу 20—30 гадоў. Менавіта ім дарожнікі ўдзяляюць увагу ў найбліжэйшы час.

стар. 3



Унікальная гісторыя аднаго гарадка
стар. 8

ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

ВАКОЛ МІНСКАГА МОРА...

У жыхароў сталіцы і навакольных вёсак вялікай папулярнасцю карыстаецца адпачынак на Заслаўскім вадасховішчы, або, як яго любоўна называюць у народзе, на Мінскім моры. За савецкім часам тут было пабудавана нямала спартыўных баз, аздараўленчых лагераў, пансіянатаў, санаторыяў. Ды з цягам часу яны прыходзілі ў непрыгоднасць, пуставалі. А некаторыя арганізацыі ўвогуле імкнуліся ад іх пазбавіцца, паколькі яны прыносілі страты. Цяпер за прывядзенне аб'ектаў у належны выгляд узяліся абласная і раённая ўлады. Распрацавана цэлая канцэпцыя развіцця тэрыторый вакол вадасховішча. У найбліжэйшай перспектыве тут будзе наведзены парадак. Наш карэспандэнт пабывала на берагах «мора», каб на свае вочы пабачыць зрухі ў гэтым кірунку.

Яшчэ два гады таму на месцы, дзе запланавана рэканструкцыя спартыўнага аздараўленчага комплексу міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», панавала цішыня. Як кажуць, ні машын, ні людзей. Цяпер жа зрухі відавочныя.

— Спартыўна-аздараўленчы комплекс знаходзіцца ў аператыўным упраўленні ўніверсітэта, яго ўласнік — Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, — праводзіць экскурсію **першы намеснік прарэктара «МІТСО» Аляксандр ЛАШЧЫНСКІ.** — Аб'ект будуецца ў дзве чаргі. Паводле планаў, першая будзе здадзена сёлета. Корпус разлічаны на 52 спальныя месцы, а кафэ на 25 чалавек. Ужо падведзены газ, вада, электрычнасць, засталіся толькі пусканаладачныя работы. Аб'ект абсалютна аўтаномны: ёсць уласная электрападстанцыя.

Другая чарга — непасрэдна добраўпарадкаванне тэрыторыі, уладкаванне пляцовак для гульні ў валейбол і баскетбол, прычалу. І будзе ўсё гэта ўведзена ў дзеянне да 2020 года.

— А чаму не раней? — пацікавілася ў Аляксандра Аляксеевіча.

— Прычына ў бюракратычных працэдурах. На тэрыторыі комплексу ёсць яшчэ і старыя аб'екты, якія неабходна зносіць. Шмат часу адбірае падрыхтоўка і зацвярджэнне праектна-каштарыснай дакументацыі. А мы не можам даваць неабгрунтаваных абяцанняў. Калі ставім задачы, то павінны іх выканаць у азначаны тэрмін.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

На дзяржаву спадзявайся, але і сам старайся

Віцэ-спікер Савета Рэспублікі наведала Дом дзіцяці ў папраўчай калоніі

Адна з першарадных задач дзяржавы заключаецца ў абароне і падтрымцы дзяцінства і мацярынства. Пра гэта на мінулым тыдні заявіла журналістам намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня Беларускага саюза жанчын Марыяна Шчоткіна пасля цырымоніі адкрыцця Дома дзіцяці ў папраўчай калоніі №4 Гомеля.

У Доме дзіцяці выхоўваюцца дзеці ва ўзросце да трох гадоў, народжаныя ў калоніі. Па словах віцэ-спікера верхняй палаты беларускага парламента, дзяржава робіць усё неабходнае, каб дзеці ні ў чым не мелі патрэбы, раслі ў годных умовах. «Бо ўсебаковая абарона дзяцей, незалежна ад таго, дзе яны нарадзіліся і хто іх бацькі, заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі ўлад, з'яўляецца першараднай задачай дзяржавы», — падкрэсліла намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Разам з тым Марыяна Шчоткіна адзначыла, што «маці, якія воляй лёсу апынуліся ў месцах пазбаўлення волі, у будучыні неабходна ўзважана ставіцца да прыняцця рашэнняў, паколькі менавіта яны нясуць адказнасць за сваіх дзяцей». Толькі яны ў сілах зрабіць так, каб іх дзеці былі шчаслівыя, выраслі ў любові, атрымалі адукацыю, знайшлі сябе ў жыцці.

Крок у бок Азіі

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі правяла сустрэчу з паслом Азербайджана

На мінулым тыдні намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Марыяна Шчоткіна сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Азербайджанскай Рэспублікі ў нашай краіне Лаціфам Сейфадзін аглу Гандзілавым.

Быў абмеркаваны шырокі спектр актуальных пытанняў двухбаковых адносін, у тым ліку міжпарламенцкае ўзаемадзеянне і гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Бакі выказалі ўзаемную зацікаўленасць у далейшым пашырэнні ўзаемавыгадных сувязяў. У сустрэчы таксама прыняў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў.

Па адным шляху. Шаўковым

Сяргей Рахманаў правёў шэраг сустрэч з прадстаўнікамі Турэцкай Рэспублікі

Плённым выдаўся мінулы тыдзень для старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея Рахманава. Ён правёў дзве сустрэчы з прадстаўнікамі Турцыі, а таксама выступіў перад выкладчыкамі і студэнтамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Сенатар сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Кезбан Нілванай Дарамай. Бакі падрабязна абмеркавалі стан і перспектывы развіцця беларуска-турэцкага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, а таксама шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, культурнай і іншых сферах.

Праз некалькі дзён пасля гэтай падзеі адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі і ў той жа час кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Турэцкай Рэспублікі Сяргея Рахманава з першым намеснікам міністра замежных спраў Турцыі Ахметам Йылдызам. Бакі падрабязна абмеркавалі пытанні пашырэння беларуска-турэцкага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, адукацыйнай, турыстычнай сферах і іншых галінах. Асаблівую ўвагу прысутныя скіравалі на ўдзел Беларусі і Турцыі ў будаўніцтве эканамічнага пояса «Шаўковага шляху». У заключэнне спадар Ахмет Йылдыз запрасіў парламенцкую дэлегацыю Рэспублікі Беларусь наведаць Турцыю для абмеркавання напрамкаў двухбаковага ўзаемадзеяння.

У рамках правядзення адзінага дня інфармавання Сяргей Рахманаў на мінулым тыдні выступіў перад прафесарска-выкладчыцкім складам і навучэнцамі ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на тэму «Саюзная дзяржава: 20 гадоў сумеснага развіцця». Падчас дыскусіі быў абмеркаваны шырокі спектр пытанняў міжнароднага супрацоўніцтва з улікам інтарэсаў Беларусі.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

БЕЗ МЕЖ

І ДАПАМОГА ЛІДСКАМУ ЗАМКУ

Польская парламенцкая дэлегацыя наведала нашу краіну

На працягу мінулага тыдня беларускую сталіцу наведала дэлегацыя ад ніжняй палаты польскага парламента. Яе ўзначаліў старшыня польска-беларускай парламенцкай групы, дэпутат сейма Адам Андрушкевіч. Перад сустрэчай з членамі Асацыяцыі польскага бізнесу ў Беларусі ён падкрэсліў, што галоўнай мэтай візіту польскіх парламентарыяў з'яўляецца развіццё перш за ўсё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, канстатаваў, што «ўзаемаадносіны нашых дзвюх краін развіваюцца павольна, але правільна». Ён нагадаў, што падчас мінулага прыезду гасцей была агучана неабходнасць правядзення Форуму рэгіёнаў Беларусі і Польшчы.

Па словах старшыні Пастаяннай камісіі, адказнасць за падобнага плана мерапрыемствы традыцыйна бяруць на сябе менавіта парламентарыі. «Форум — гэта пляцоўка, дзе можна паказаць сябе, задаволіць уласны інтарэс і замацаваць гэта афіцыйна», — падкрэсліў Уладзімір Панцюхоў. Менавіта таму ён спадзяецца, што ўзаемныя парламенцкія візіты польскага і беларускага боку ўжо ў маі гэтага года канчаткова высветляць дату і форму правядзення Форуму рэгіёнаў нашых краін.

У сваю чаргу **Андрэй НАВУМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, кіраўнік працоўнай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Польшча,** растлумачыў, што дыялог з дэпутатамі Польшчы выбудаваны адкрыты і давяральны. «У нас няма закрытых тэм, мы абмяркоўваем усе пытанні — ад палітыкі і эканомікі да сацыяльнага развіцця, уключаючы ахову здароўя, культуру і адукацыю. Акрамя таго, мы разлічваем на прыцягненне польскіх інвестыцый, польскага капіталу ў Беларусь».

Андрэй Навумовіч таксама адзначыў, што ў межах візіту польская дэлегацыя наведвала ў тым ліку і Лідскі замак. «Я з'яўляюся дэпутатам ад Лідскага рэгіёна, таму мне б хацелася, выкарыстоўваючы магчымасці трансгранічнага супрацоўніцтва, прыцягнуць сродкі польскіх інвестараў для завяршэння яго будаўніцтва», — падкрэсліў дэпутат і адзначыў, што такая прапанова ўжо агучана калегам з Польшчы і будзе абмяркоўвацца.

У сваю чаргу, старшыня польска-беларускай парламенцкай групы Адам Андрушкевіч адзначыў, што галоўная задача візіту — абмеркаванне эканамічных пытанняў. «Наша сённяшняя сустрэча і ўвесь візіт у Беларусь праходзіць пад знакам эканамічнага супрацоўніцтва, таму мы сустракаемся не толькі з дэпутатамі, але і з прадстаўнікамі бізнесу. Мы ўжо наведалі дастаткова паспяховыя прадпрыемствы ў Навагрудку і Лідзе і бачым, што нашы краіны могуць добра працаваць разам», — сказаў ён.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

ВАКОЛ МІНСКАГА МОРА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Як запэўніў мой суразмоўнік, тут будуць створаны камфортныя ўмовы для адпачынку студэнтаў і выкладчыкаў. Будзе і выбар з пражываннем: акрамя асноўнага корпуса, людзі змогуць спыніцца і ў невялікіх летніх доміках.

...Рэстаран «Заслаўе» пабудаваны ў 1976 годзе. Раней сюды немагчыма было трапіць. Але з цягам часу ўстанова стала нерэнтабельнай і яе закрылі. Так і пуставаў некалькі гадоў будынак, пакуль яго з аўкцыёна не набыло сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Міруар».

— Замест рэстарана тут з'віцца шматфункцыянальны комплекс: СПА-атэль, басейн, пункт грамадскага харчавання, — тлумачыць дырэктар таварыства Георгій Савіцкі.— Увесці ў дзеянне комплекс плануецца праз два гады. Ужо атрымалі заключэнне на знос старога будынка. У далейшым будзе праведзены тэндар па выбары падраднай арганізацыі. Будаўніцтва, па папярэдніх разліках, абыдзецца прыкладна ў 7 млн еўра. Інвестар — замежная кампанія.

На базе адпачынку «Парус» мяне сустрэлі вартаўнікі — два вялікія сабакі. Следам выйшаў Вячаслаў Дварэцкі, камендант.

— Раней база належала дарожнаму ўпраўленню «Белаўтастрада», якую затым расфарміравалі, а будынкі перадалі Аўтадарцэнтру. У сувязі з тым, што база не эксплуатуецца, яе выставілі на аўкцыён, — адзначыў Вячаслаў Казіміравіч.

Разам з тым відаць, што тут падтрымліваюць парадак і чысціню, — домікі пафарбаваныя, газоны дагледжаныя...

На месцы, дзе ў хуткім часе паўстане аграэкатурыстычны аб'ект, кіпіць работа, працуюць людзі, тэхніка. Калісьці тут месціўся закінуты будынак Дома рыбака. Сюды прыязджалі шматлікія аматары рыбнай лоўлі, спыняліся спартсмены падчас летніх збораў. Але драўляная канструкцыя гніла, рушылася. Новы ўласнік яе знёс, пакінуў толькі частку фундамента. Тут ужо выраслі два корпусы гасцініцы: адпаведна на 8 і 4 камфартабельныя сямейныя нумары. Людзі змогуць парыбачыць, адпачыць на прыродзе, пакаштаваць экалагічна чыстыя прадукты. На тэрыторыі плануецца разбіць агарод, дзе будуць вырошчвацца агародніна, лекавыя травы. Яны будуць выкарыстоўвацца для складання розных кампазіцый гарбаты. Дзеці змогуць азнаёміцца з культурай земляробства.

— Аб'ект належыць закрытаму акцыянернаму таварыству «Белцяжмаш», — канстатуе дырэктар вытворчага аб'яднання «Рэканструкцыя» Сяргей Несцераў. — Менавіта наша арганізацыя з'яўляецца генеральным падрадчыкам. У чэрвені гэтага года тут плануецца завяршыць усе работы, а першага верасня прыняць наведвальнікаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

У тэму

Вадзім НІКАЛАЕНКА, намеснік старшыні Камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама:

— Тэрыторыя, што прылягае да Заслаўскага вадасховішча, мае асобы статус. Яна заўсёды разглядалася як рэакрэацыйна-ландшафтная зона, прызначаная для адпачынку гараджан, жыхароў навакольных населеных пунктаў. На аснове праектаў развіцця тэрыторый Мінскага раёна і сталічнай вобласці распрацаваны генеральны план развіцця тэрыторый вакол Заслаўскага вадасховішча. Вызначана 17 аб'ектаў, над якімі неабходна папрацаваць, у тым ліку і ў сувязі з іх функцыянальным прызначэннем. Папярэдне праводзіліся нарады з уласнікамі. У выніку ўлады прынялі адпаведныя рашэнні. І цяпер ідзе іх паэтапная рэалізацыя. Мяркую, праз два-тры гады тут з'явяцца аб'екты самага высокага ўзроўню.

Алена ЧАБАТАРЭНКА, начальнік упраўлення па распараджэнні маёмасцю Мінскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці:

— Сёлета ў Мінскай вобласці плануецца прыцягнуць у эксплуатацыю больш як 300 аб'ектаў. Для кожнага з іх вызначаны канкрэтны спосаб: арэнда, продаж, перадача іншай арганізацыі. Некаторыя з іх не падлягаюць далейшаму выкарыстанню, а ў іншых выпадках не знайшлося прымальных шляхоў рашэння праблемы. Таму дзяржава іх кансервуе, каб у далейшым знайсці добрасумленнага ўласніка, які навёў бы тут парадак.

АРТЭРЫІ ДЗЯРЖАЎНАГА ЗНАЧЭННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У многіх краінах асноўная крыніца дарожных фондаў менавіта падатак. А вось сама тэхналогія збору можа быць рознай. Да прыкладу, з продажу аўтамабільнага паліва. У Беларусі з 2014 года спаганяецца дзяржаўная пошліна на транспарт.

Цяпер размеркаванне гэтай пошліны робіцца па такім сцэнарыі: 61% накіроўваецца ў рэспубліканскі бюджэт, а 39% — у мясцовыя. Падобную формулу з наступнага года збіраюцца абнавіць і палову грошай пакідаць на развіццё рэгіянальных дарог. Дзяржаўную праграму плануюць дапоўніць пунктамі аб мясцовых дарогах. А ў хуткім часе з'явіцца дакладны пералік трас, якія патрабуюць рамонту. Тыпавыя праекты ўжо распрацаваны, рашэнне будзе прымацца пасля тэхналагічнай экспертызы, якая вызначыць, дзе і якое пакрыццё мэтазгодна выкарыстоўваць.

У Міністэрстве фінансаў нават падлічылі, што на капітальны рамонт і прывядзенне ў парадак мясцовых аўтамабільных дарог у перыяд з 2017 па 2020 год будзе накіравана каля 900 млн рублёў. Гэта будуць сродкі рэспубліканскага дарожнага фонду і мясцовых бюджэтаў. Лічыцца, што ўжо сёлета на паляпшэнне мясцовых дарог накіруюць каля 120 млн рублёў за кошт названых крыніц. Фінансісты ўпэўнены, што крыху менш за палову неабходнай сумы — каля 40% — складуць сродкі ад дзяржпошліны.

І яшчэ. Адна справа назбіраць грошы з аўтаўладальнікаў і ўзяць з бюджэту, а другая — правільна іх выкарыстаць. Таму Прэзідэнт даручыў пралічыць аб'ектыўную цану кожнага квадратнага метра. І на выдзеленыя сродкі за кошт беражлівага і гаспадарчага падыходу аднавіць да 7 тысяч кіламетраў палатна. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што тэхналогій у нас для выканання гэтай задачы дастаткова. Спецыялістам даецца тры-чатыры гады, каб не проста адшукаць нейкія сродкі, а дакладна вызначыцца і прывесці ў нармальны стан дарогі за тыя грошы, якія будуць выдаткаваны.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

У тэму

Вольга ПАЛІТЫКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:

— У наступныя гады краіне неабходна прафінансаваць аднаўленне тых дарог, якія знаходзяцца ў найбольш крытычным стане. Абласныя дарожныя арганізацыі ўсю неабходную інфармацыю па гэтай тэме падрыхтавалі і накіравалі Прэзідэнту краіны. Таму сёння існуе пералік дарог, якія неабходна адрамантаваць у першую чаргу. Экспертамі цяпер распрацоўваецца механізм фінансавання такога рашэння.

Прадугледжана, што інвестыцыі ў развіццё мясцовых дарог могуць паступаць і за кошт сродкаў ад збору дзяржаўнай пошліны, якая спаганяецца за допуск аўтатранспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху. На гэтыя мэты таксама будуць накіраваны грошы ад крэдыту банка «Развіццё» і, магчыма, сродкі, якія застануцца сёлета ў інвестыцыйным фондзе. Дакладны алгарытм фінансавання будучых работ па мясцовых дарогах сёння распрацоўваецца ў Мінтрансе. Наша задача як дэпутатаў скрупулёзна прапісаць у праекце бюджэту на наступны год механізм размеркавання сродкаў дарожнага фонду. Вядома, што дзяржпошліна спачатку паступае ў дарожны фонд, пасля чаго размяркоўваецца па мясцовых бюджэтах абласцей і ў рэспубліканскую казну.

Я з'яўляюся прадстаўніком Баранавіцкай акругі. Баранавічы лічацца горадам абласнога падпарадкавання, але ў нас ёсць вуліцы, якія з'яўляюцца працягам мясцовых і рэспубліканскіх дарог ужо на тэрыторыі населенага пункта. Мне здаецца вельмі важным, каб, завастрыўшы ўвагу на стане мясцовых дарог, мы не забыліся пра такія вуліцы. Гэта праблема актуальная для ўсіх гарадоў абласнога падпарадкавання.

А сёлета дарогі Баранавічаў патрабуюць сур'ёзнага рамонту, бо гэта звязана з павелічэннем інтэнсіўнасці аўтамабільнага руху і росту колькасці машын у насельніцтва. Больш за тое, вакол Баранавічаў не існуе кальцавой дарогі, а велікагрузныя аўтамабілі рухаюцца часткова і па гарадскіх вуліцах, што істотна псуе дарожнае пакрыццё.

Галіна ФІЛІПОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:

— Як дэпутат ад Гомельскай вобласці заўважу, што і ў нашым рэгіёне хапае не вельмі якасных мясцовых дарог. Пасля правядзення адпаведнай нарады ў Прэзідэнта гэта пытанне было разгледжана кіраўніцтвам вобласці. Тады губернатарам рэгіёна было прынята рашэнне не хапацца за рамонт адразу ўсіх «слабых» дарог, а займацца вырашэннем гэтай праблемы па чарзе. Плануецца наводзіць парадак у сетцы мясцовых дарог у 2—3 раёнах вобласці штогод.

Мясцовыя ўлады раёнаў Гомельшчыны такі падыход падтрымалі і вельмі спадзяюцца на рашэнне Прэзідэнта краіны аб дадатковым фінансаванні структуры згаданых дарог.

Мікіта БЫЧКОЎ, аматар вандровак:

— Мне як турысту, які шмат падарожнічае па Беларусі, скардзіцца асабліва няма на што. Дарожнае пакрыццё ў нашай краіне, як правіла, вельмі якаснае. У прыватнасці, гэта датычыцца тых трас, што вядуць да самых цікавых гарадоў і галоўных славутасцяў Беларусі. Даехаць да любога абласнога горада ці, напрыклад, Нарачы, іншых найбольш папулярных мясцін не з'яўляецца праблемай. Галоўнае, на што я звярнуў бы ўвагу, — невялікая колькасць указальнікаў на лацініцы. Думаю, самастойным турыстам з Заходняй Еўропы будзе вельмі цяжка сарыентавацца ў нашай краіне. Яшчэ адзін момант датычыцца прыдарожнага сэрвісу: калі на Захадзе знайсці месца для перакусу ці банальную прыбіральню не праблема, то ў нас, звярнуўшы з трасы М1, часам можна праехаць 40—50 кіламетраў і не сустрэць ніводнай запраўкі.

НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

Патрэбна даро́га, але не до́рага

Чаму «бетонкі» варта будаваць і ў рэгіёнах?

НЕ апошнюю ролю ў навядзенні парадку з мясцовымі дарогамі — чаго на пачатку красавіка запатрабаваў Прэзідэнт — павінны адыграць айчынныя навукоўцы. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што тэхналогій для стварэння якасных і сучасных дарог у краіне дастаткова, але, як вядома, няма мяжы дасканаласці. Распрацоўкі, вынікі якіх могуць дапамагчы дарожнікам, вядуцца ў цэлым шэрагу ўстаноў, адна з іх — факультэт транспартных камунікацый Беларускага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. Аб тым, што ўжо зроблена і што плануецца зрабіць, каб мясцовыя шляхі сталі лепшымі, «Мясцоваму самакіраванню» расказаў дэкан факультэта, доктар тэхнічных навук, прафесар Аляксей БУСЕЛ.

— Галоўны кірунак, які развіваецца якраз з падачы Прэзідэнта, — будаўніцтва мясцовых бетонных дарог, — адзначае эксперт. — Насамрэч, мы маем досвед узвядзення такіх транспартных артэрый яшчэ з 1980-х гадоў. Якраз па гэтай тэхналогіі стваралася алімпійская траса Брэст — Масква. Дзякуючы таму, што на праект працавалі буйныя цэментныя заводы СССР, мы пачалі будаваць і мясцовыя дарогі з бетону. У выніку іх агульная даўжыня склала больш за 800 кіламетраў. Амаль за 40 гадоў службы яны паказалі сябе вельмі добра і дагэтуль з'яўляюцца «касцяком» транспартнай сеткі ў рэгіёнах.

Ці сапраўды асфальтавым мясцовым дарогам патрэбна «перазагрузка»? Аляксей Бусел упэўнены, што такая патрэба наспела. У першую чаргу для Беларусі як краіны з развітой сельскай гаспадаркай важны фактар змянення стандартаў сучаснай сельгастэхнікі. Яна стала больш энерганасычанай і магутнай, што адпаведна паўплывала на памеры і масу. Дарогі, створаныя па старых праектах, нярэдка не вытрымліваюць такія нагрузкі. Трэба таксама адзначыць, што пры будаўніцтве новых трас падвоз будматэрыялаў на магутных самазвалах ажыццяўляецца па мясцовай транспартнай сетцы. Атрымліваецца, што пры будаўніцтве новага дарожнікі нярэдка разбураюць старое. Нельга не сказаць і пра сучасныя аўтацягнікі — нагрузка на вось у іх велізарная. Таму развіццё бетоннага дарожнага будаўніцтва — найлепшы шлях для нашай краіны.

— Якая асноўная перавага аўтамабільнага транспарту? — задаецца пытаннем прафесар. — Ён дастаўляе тавар ад вытворцы да спажыўца, таму падтрымліваць мясцовыя дарогі ў добрым стане надзвычай важна для эканомікі. А яшчэ гэта працаўладкаванне, развіццё інфраструктуры... У нас ёсць буйныя цэментныя заводы — таму з сыравінай праблем быць не павінна. Бітум, які выкарыстоўваецца ў вытворчасці асфальтабетону, можна накіраваць на іншыя мэты. Словам, выгады бетонных дарог відавочныя. А досвед другой Мінскай кальцавой паказаў, што мы можам ствараць такія шляхі зносін на вельмі высокім узроўні. Кошт будаўніцтва не нашмат перавышае асфальтабетон, але па тэрмінах эксплуатацыі яны значна лепшыя.



Фота Надзеі БУЖАН.

Асноўная маса навуковых даследаванняў датычыцца распрацоўкі матэрыялаў якраз для бетоннага пакрыцця.

— Галоўнае пытанне цяпер у структуры бетону, які будзе выкарыстоўвацца, — тлумачыць Аляксей Бусел. — Напрыклад, ці патрэбна яму арміраванне, якія дабаўкі трэба дадаваць у раствор для таго, каб ён хутка цвярдзеў. Цэмент застывае 28 сутак — мы не можам дазволіць сабе перакрываць дарожны рух на такі час. Акрамя таго, зімой выкарыстоўваем шмат солі, што прыводзіць да карозіі пакрыцця, — бетон, у адрозненне ад асфальту, да гэтага вельмі адчувальны. Менавіта таму мы цяпер чакаем і не ўжываем супрацьгалалёдныя матэрыялы на другой Мінскай кальцавой. Але гэта вымушае абмяжоўваць хуткасць руху аўтамабіляў па ёй.

Айчынныя навукоўцы ўжо вынайшлі матэрыялы, якія абароняць дарогу ад разбурэння, асабліва ў першыя гады, пакуль яна набірае трываласць. Яшчэ на пачатку 2000-х такім спосабам быў апрацаваны кавалак трасы М-3 (Мінск — Віцебск), тэхналогія даказала сваю прыгоднасць. Састаў каштуе невялікіх грошай, яго вырабляюць на Гомельскім хімічным заводзе, але ўкараніць распрацоўку пакуль не атрымліваецца. Чаму — пытанне застаецца адкрытым. Тым часам кіроўцы выказваюць незадаволенасць хуткасным рэжымам...

— Вельмі перспектыўныя праекты ў гэтай сферы ёсць у Нацыянальнай акадэміі навук, — адзначае Аляксей Бусел. — У Інстытуце агульнай і неарганічнай хіміі, напрыклад, распрацоўваецца цэлы шэраг матэрыялаў для будаўніцтва дарог, у тым ліку і мясцовых. У прыватнасці, адзначыў бы працы па саставах на аснове эмульсійных тэхналогій. Сутнасць распрацоўкі заключаецца ў тым, што ў якасці будаўнічага рэсурсу выкарыстоўваецца халодная дысперсія бітуму ў вадзе. Для яе ажыццяўлення не трэба будаваць асфальтавыя заводы, акрамя гэтага, яна практычна не ўплывае на экалогію. Ёсць і праекты па гравійна-эмульсійных сумесях. НАН вельмі цесна працуе з «Гомельаблдарбудам», які ўкараняе іх распрацоўкі якраз на мясцовых дарогах.

Беларускі дарожны навукова-даследчы інстытут спрабуе знайсці рашэнні па аднаўленні асфальтабетонных дарог, якія знаходзяцца ў дрэнным стане. Яны адпрацоўваюць тэхналогію, якая называецца ўайттопінг, калі бетон укладваецца зверху старога асфальтавага пакрыцця. Нясучая здольнасць дарогі ў такім выпадку падымаецца да ўзроўню, калі па ёй можна прапускаць практычна любую тэхніку. На кафедры будаўнічых дарожных машын усё таго ж БНТУ рыхтуюць кадры і тэхніку для дарожнага будаўніцтва, гэты аспект таксама важны.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

А як у іх?

З гумы...

Выкарыстаць каўчук у якасці дарожнага пакрыцця ўпершыню вырашылі брытанцы яшчэ ў пачатку XX стагоддзя. Тады справа была ў шуме, які рабілі тагачасныя аўтамабілі. Нядаўна пра ідэю ўспомнілі нашы суседзі палякі, і ў 2015 годзе мясцовыя вытворцы асфальту распрацавалі тэхналогію атрымання бітуму з дадаваннем гумавай крошкі. Апошнюю атрымліваюць пры перапрацоўцы старых аўтамабільных шын. Іх разбіраюць, здрабняюць і ў вадкім стане дадаюць да бітуму. Атрымліваецца адмысловае вязкае рэчыва для будаўніцтва дарог. Для вытворчасці сумесі на 1 кіламетр пакрыцця трэба ў сярэднім ад 400 да 1200 пакрышак. Перавагі методыкі відавочныя. Па-першае, пакрыццё робіцца ўстойлівым да растрэсквання, старэння і нізкіх тэмператур. У сярэднім, дадаванне 15% гумавай крошкі ў раствор павялічвае тэрмін эксплуатацыі дарог на 15–20 гадоў, што дазваляе эканоміць на рамонце. Па-другое, на 3–6 дэцыбел змяншаецца ўзровень шуму, выкліканага аўтамабільным рухам. Нарэшце, гэта экалагічна – шыны не спальваюць, а перапрацоўваюць з мінімумам адходаў. У Польшчы пабудавана ўжо больш за 200 кіламетраў такіх дарог.

...з пластыку...

Іншы прыклад рацыянальнага падыходу да другасных рэсурсаў прапанавала галандская кампанія VolkerWessels. Задума заключаецца ў тым, каб ствараць суцэльныя дарожныя блокі з адтулінамі для камунікацый з перапрацаванага пластыкавага смецця. Усталёўваць іх плануецца ў падрыхтаваныя загадзя траншэі – як канструктар. Такая тэхналогія дазволіць адмовіцца ад слаіста-насыпнога метаду будаўніцтва, а таксама аблегчыць наступны рамонт і эксплуатацыю дарог. Па сцвярджэннях распрацоўшчыкаў, пакрыццё будзе значна больш трывалым, чым традыцыйнае. Яно вытрымае тэмпературу ад мінус 40 да плюс 80 градусаў, падыдзе для ўкладкі на любых глебах, а служыць дарога будзе ў тры разы даўжэй, чым асфальтабетон. Праўда, да рэалізацыі справа пакуль яшчэ не дайшла – пакатацца па пластыкавых дарогах не атрымаецца.

...і з сонечных панэляў

Зусім футурыстычны праект развіцця дарожнай сеткі прапануюць французы. Праект будаўніцтва аўтабанаў з пакрыццём з сонечных панэляў ужо зацверджаны ўрадам краіны, да 2021 года там павінна з'явіцца тысяча кіламетраў дарог «двайнога» прызначэння. Умацаваныя фотаэлектрычныя блокі з тонкай плёнкай з полікрысталічнага крэмнію будуць усталёўваць проста на дарожнае пакрыццё. Пры гэтым стваральнікі запэўніваюць, што такая магістраль без дэфармацыі вытрымае нагрузку машыны вагой да 115 тон, што дазволіць прапускаць па ёй самыя буйныя аўтацягнікі. Галоўная перавага, зразумела, заключаецца ў магчымасці генерыравання энергіі. Праект забяспечыць таннай электраэнергіяй каля 5 мільёнаў чалавек – гэта 8 працэнтаў насельніцтва Францыі. Дарэчы, у 2010 годзе падобную задуму пачалі прасоўваць у ЗША, таму цалкам магчыма, што ў хуткім часе нікога ўжо не здзівіш дарогай з сонечных батарэй.

ПА-СУСЕДСКУ

Куды вядзе магістраль

ГЭТА тэма актуальная для кожнага рэгіёна. Але для Гродзеншчыны асабліва, бо менавіта выгляд і стан памежжа ўплываюць на першыя ўражанні замежнага турыста. Выбоіны на дарожным палатне могуць не толькі выклікаць у прыезджых іранічную ўсмешку, але і наогул сапсаваць настрой і ўяўленне аб краіне. Пакутуюць ад штодзённай трасяніны і мясцовыя жыхары.

ЁСЦЬ ІНВЕСТАР

У сітуацыі, калі бюджэтнага фінансавання на дарогі недастаткова, улады Гродзенскага раёна пачалі шукаць іншыя шляхі. Разам з суседзямі-палякамі вырашылі падрыхтаваць праект па добраўпарадкаванні транспартнай інфраструктуры памежных тэрыторый. Такім чынам, Гродзенскі раён прыняў удзел у адным, а затым у другім «дарожным» праекце трансгранічнай праграмы «Польшча–Беларусь–Украіна». У выніку было адрамантавана два ўчасткі дарогі на памежнай тэрыторыі. Адзін вядзе непасрэдна да польскай мяжы, другі – да Аўгустоўскага канала.

У рамках праекта засвоена 2,4 млн еўра, на якія адрамантавана 18 км дарожнага палатна, устаноўлены павільёны на прыпынках, добраўпарадкаваны адхоны і з'езды.

ТРЫМАЮЦЬ ПАРАДАК

У Падлабенскім сельсавеце добра памятаюць дарогу яшчэ да рэканструкцыі, калі капітальныя работы не вяліся амаль трыццаць гадоў, а толькі час ад часу латаліся выбоіны. Спецыяліст сельвыканкама Марыя Касава ўспамінае, якое грандыёзнае будаўніцтва пачалося на іх трасе, колькі рабочых і дарожнай тэхнікі было задзейнічана... І як змяніўся ўчастак дарогі за кароткі час.

На прадпрыемстве «Гроднаабліарбуд» расказалі, што траса стала шырэйшай, поўнасцю перакладзена асфальтабетоннае пакрыццё, павялічылася прапускная здольнасць і бяспека. У сельвыканкаме, у сваю чаргу, адзначылі, што жыхары задаволены новымі павільёнамі на прыпынках, усталяванымі апорамі з асвятленнем. А галоўнае – траса не разбіваецца, хоць па ёй ходзіць і сельскагаспадарчая тэхніка. Нядаўна тут аднавілі дарожную разметку.

Санітарны стан прыдарожнай паласы – на асобным кантролі старшыні сельскага Савета. Два разы на тыдзень работнікі па азеляненні прыбіраюць смецце на абочыне, сочаць, каб не былі пашкоджаны шыльды і знакі.

НОВЫЯ ПЛАНЫ

Сёлета Гродзенскі раён працягвае «дарожную» тэму. На чарговы этап трансгранічнай праграмы заяўлена ажно восем праектаў. Участкі розныя – ад 3 да 12 кіламетраў. Агульная працягласць складае больш за 60 кіламетраў. Якія з іх трапяць у фінал конкурсу, будзе вядома толькі ў жніўні.

– Канкурэнцыя вялікая, прэтэндэнтаў на адно месца амаль пятнаццаць, – расказала **начальнік вытворчага аддзела «Гроднаабліарбуда» Марына КІРЫЛА**. – Але мы спадзяёмся, што нейкая частка праектаў выйдзе ў фінал.

Па словах Марыны Кірыла, гэту справу трэба актыўна рухаць наперад. Бо сродкі, якія выдзяляе Еўрапейскі саюз, бязвыплатныя. Так, па двух папярэдніх праектах гродзенцы атрымалі 2,4 млн еўра. А вось узгадненне на нацыянальным узроўні часам зацягваецца. Пры тым, што праект ужо выйграў.

– Бывае, што працэс доўжыцца паўгода, – рэзюмуе Марына Кірыла, – у нас шмат бюракратычных перашкод, якія стрымліваюць асваенне сродкаў. У палякаў працэс узгаднення значна карацейшы. Хацелася б, каб у нас таксама было менш бюракратыі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Мясцовыя ўлады шукаюць і знаходзяць сродкі для рамонту

НАША ДАВЕДКА

Першы конкурс Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча–Беларусь–Украіна 2014–2020» прадугледжвае бюджэт 80 млн еўра. Сума гранта вагаецца ад 100 тысяч да 2,5 млн еўра.

У ТЭМУ

Валерый БАЛАШОЎ, намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама:

– Як толькі пабудавалі дарогі, людзі пачалі выкупляць участкі, будаваць аграсядзібы. Гэта садзейнічае турыстычнаму патэнцыялу раёна, тым больш, што на тэрыторыі парка «Аўгустоўскі канал» дзейнічае бязвізавая зона. Мы зацікаўлены ў паляпшэнні дарог, бо гэта новы ўзровень жыцця, новыя працоўныя месцы, развіцце прыдарожнага сэрвісу.

ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

Як у Прыдзвінскім краі збіраюцца выканаць даручэнне Прэзідэнта – прывесці ў парадак дарогі мясцовага прызначэння? Гэта высвятляў наш карэспандэнт.

У 2,7 раза менш... за экватар

Віцебская вобласць, між іншым, на другім месцы ў краіне пасля Мінскай па працягласці такіх дарог. Яна – лідар па колькасці населеных пунктаў (каля 6 тысяч). І дарога да кожнага, незалежна ад колькасці насельніцтва, павінна быць у добрым стане.

На жаль, у трох райвыканкамах, куды я звярнуўся па каментарый, адмовіліся нешта казаць на гэту тэму. Тым больш паказаць з выездам на месца. Маўляў, чаму менавіта наш раён? Спасыляліся на недахоп фінансавання: «Ну вы ж разумееце...» Паводле іх слоў, былі б грошы, усе дарогі прывялі б у ідэальны стан.

Якія яны – крыніцы грашовых патокаў на пракладку, рамонт дарог, падтрыманне іх у добрым стане?

У Віцебскім аблвыканкаме канстатавалі, што працягласць дарог толькі мясцовага значэння 14 960 кіламетраў. Лідзіруе тут Пастаўскі раён – 998 кіламетраў. У Віцебскім адпаведна – 931, Гарадоцкім – 923, Полацкім – 860, Аршанскім – 768...

Плюс яшчэ 3,5 тысячы кіламетраў – працягласць дарожнага пакрыцця рэспубліканскага значэння, уключаючы і міжнародныя трасы. Іх утрыманне фінансуецца выключна з рэспубліканскага бюджэту. Для параўнання, даўжыня акружнасці экватара трохі больш за 40 тысяч 75 кіламетраў.

Дарожнікі адказваюць і за 858 мастоў, і водапрапускных труб пад імі. Усе трубы, дарэчы, выпрацавалі свой нарматыўны рэсурс...

– Дарог становіцца ўсё больш. Напрыклад, недзе з'явіліся новыя могілкі – неабходна зрабіць пад'езд. У іншым месцы ферму пабудавалі – таксама. Да новабудоўляў – асобных дамоў і цэлых мікрараёнаў – таксама неабходна забяспечыць пад'езды, – расказвае **выконваючая абавязкі начальніка аддзела транспарту і камунікацый Віцебскага аблвыканкама Сняжана ЦІТОВА**.

Асфальт – задавальненне дарагое

Больш за 3 тысячы кіламетраў абласных дарог грунтавыя. Многае робіцца, каб яны заставаліся ў належным стане. Зімой, у прыватнасці, дарогі чысцяць ад снегу, раскідваюць субстанцыі супраць галалёду. У цёплую пару года, калі трэба, прывозяць і рассыпаюць грунт, прафілююць. Нават, калі ў вёсцы жыве адзін чалавек, да яго без праблем павінны даехаць «хуткая», іншыя службы, машына пошты, аўталаўка і гэтак далей...

За мясцовыя дарогі адказвае КУП «Віцебскаблдарбуд». Цікава, што прадпрыемства мае аж 21 асфальтабетонны завод. Прадукцыю рэалізуюць іншым арганізацыям, якія адказваюць за рамонт дарог, сельскагаспадарчым прадпрыемствам, грамадзянам...

Будаўніцтва аднаго кіламетра дарогі да дэнамінацыі абыходзілася прыкладна ў 2,5 мільярда рублёў. Сёння да 50% сродкаў, якія выдзяляюцца на дарогі, накіроўваюць на ўтрыманне. Фінансаванне адбываецца з абласнога бюджэту і рэспубліканскага (субвенцыі, якія перадаюцца з дарожнага фонду). Канкрэтна грошы расходуюць на ямачны рамонт, прафіляванне, афарбоўку палос і дарожных знакаў, уборку, падкоску абочын.

– Гэта цэлы комплекс мерапрыемстваў для падтрымання дарог у здавальняючым стане. У населеных пунктах яны знаходзяцца на балансе арганізацый ЖКГ. Адпаведна адтуль і ідзе фінансаванне, – тлумачыць нюансы Сняжана Цітова.

Толькі летась на Віцебшчыне адрамантавалі каля 136,1 кіламетра дарог. На 128,9 тысячы «квадратаў» зрабілі ямачны рамонт...

«Ало, адрамантуйце!»

Напэўна, яшчэ параўнальна мала суграмадзян ведаюць пра існаванне «гарачых ліній» дарожнікаў. Колькі разоў аўтар гэтых радкоў чуў скаргі па тэме на «прамыя лініі» аблвыканкама, райвыканкамаў і Віцебскага гарвыканкама. А можна ж было не «абліваць брудам» дарожнікаў, а ўзяць і патэлефанаваць у «дыспетчарскую». Агульны рэспубліканскі нумар тэлефона 125. Усе званкі бяруцца на заметку. Пры наяўнасці сродкаў стараюцца адрамантаваць праблемны ўчастак. Доўга не зацягваючы, убіраюць снег, падсыпаюць...

Каб працягнуць «жыццё дарог», зімой і летам уводзіцца так званае «абмежаванне на вось» транспарту. Удзельнікі руху кампенсуюць фінансава права праезду велікагрузных «колаў».

У аблвыканкаме фіксуюць усе сігналы насельніцтва наконт утрымання і пракладкі дарог – яны ўлічваюцца пры фарміраванні адпаведнай праграмы на наступны год. Звароты знаходзяцца на кантролі і часта задавальняюцца. Але, зразумела, пры наяўнасці фінансавых сродкаў. Прыярытэт – дарогам да школ, да аграгарадкоў.

Ці зацікавяць інвестараў мясцовыя дарогі? Наўрад ці. Па-першае, сёння абазначаны толькі дзве крыніцы фінансавання: рэспубліканская і абласная. Па-другое, ну нявыгадна будзе ўкладваць грошы ў дарогу, па якой праходзіць параўнальна невялікі паток аўто.

Як агучыў Прэзідэнт для прывядзення ў парадак мясцовых дарог, магчыма, будуць прыцягваць крэдыты. Ужо ёсць прыклад, калі мясцовая ўлада выкарыстоўвае пазабюджэтныя сродкі. У Полацку пры падтрымцы ЕС упершыню ў вобласці размецілі паласу для веласіпедыстаў.

У аддзеле па працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Віцебскага аблвыканкама канстатуюць, што колькасць «дарожных зваротаў» змяншаецца. Летась іх было 104, а ў пазамінулым годзе – 125.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

«ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ЛЮДЗЕЙ — ПРЫЯРЫТЭТ №1»

Такое меркаванне выказаў старшыня Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў

БОЛЬШАСЦЬ беларусаў разумее, для чаго нам патрэбныя раённыя выканаўчыя камітэты, але праца мясцовых Саветаў дэпутатаў для выбаршчыкаў часам застаецца загадкай. Газета «Мясцовае самакіраванне» вырашыла запоўніць гэты прабел. Над чым сёння працуе Савет дэпутатаў у раёне, і як народныя выбраннікі дапамагаюць людзям — аб гэтым наш карэспандэнт пагутарыў са старшынёй Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандрам САРАКАЧОМ.

— Давайце адразу «з месца ў кар'ер»: якія праблемы сёння існуюць у Дзяржынскім раёне?

— Праблемы ў жыцці ёсць заўсёды, але ўсе яны вырашаюцца. Пасля зімы, як заўсёды, самая галоўная праблема — гэта дарогі. Была марозная зіма, месцамі асфальт стаў разбурацца. Яшчэ ёсць некаторыя пытанні па ЖКГ. Але мы заўсёды дзелімся інфармацыяй у раённай газеце пра тое, што і дзе будзе адрамантавана. І людзі бачаць: ідзе рэальная работа. Магу сказаць, што і Дзяржынск, і раён у цэлым сапраўды папрыгажэлі за апошнія гады. Мы прыводзім да ладу дарогі, жыллёвы фонд, усталёўваем двухсхільныя дахі. Увогуле, спраўляемся з праблемнымі момантамі па графіку.

— Якія задачы стаяць перад Дзяржынскім раённым Саветам дэпутатаў на найбліжэйшы час?

— Мы сумесна з рознымі органамі вельмі добра супрацоўнічаем па Дэкрэце №3. Дапусцім, з сельсаветамі мы вывяраем спісы тых, хто павінен выплаціць падатак. Сустракаемся з людзьмі, якія сапраўды хочуць працаваць, але не могуць уладкавацца, — стварылі спецыяльную камісію. Разам з цэнтрам занятасці знаходзім вакансіі, якія могуць зацікавіць беспрацоўных. Цяпер гэта адна з галоўных задач. Яшчэ адна задача — навядзенне парадку на зямлі. Вядзецца вельмі сур'ёзная работа з кіраўнікамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, прамысловасці, грамадзянамі, сельсаветамі па гэтай частцы. На самай справе, нічога незвычайнага, проста робім так, каб людзям было камфортна жыць.

— Як прадстаўнік народных інтарэсаў, вы часта кантактуеце са звычайнымі людзьмі?

— Часта, вельмі часта. Нават не буду казаць аб «прамых лініях» — гэта ж увесь час на слыху. Таксама кожны панядзелак у мяне прыёмны дзень. Я праводжу выязны прыём па сельскіх Саветах. І перад тым як паехаць, абавязкова праязджаю па вёсках, па вуліцах, гляджу на рэальны стан населенага пункта. Таму прамы кантакт з людзьмі пастаянны. Акрамя таго, грамадзяне тэлефануюць, любы чалавек можа звярнуцца. Бо жыццё людзей для нас — гэта прыярытэт №1. Калі праблем і скаргаў няшмат, гэта сведчыць аб тым, што мясцовая ўлада вырашае пытанні. Прывяду статыстыку: зараз на прамую лінію тэлефануе 2—3 чалавекі, часам наогул не тэлефануе ніхто. А калі мы пачыналі, то было па 8—10 званоў. Лічбы красамоўныя.

— Дэпутат у Дзяржынскім раёне — які ён?

— Ведаеце, класічнае і адзінае азначэнне падабраць складана, бо ўсе людзі розныя. Вядома, дэпутату неабходна мець дзелавое здаровае стаўленне і мысленне. Калі чалавек ідзе ў дэпутаты, то ён павінен разумець, што гэта няпростая праца. Трэба ведаць сваю справу, быць прыстойным. І, вядома, спагадлівым.

— Выбаршчыкі ў вашым раёне ведаюць, што прапануюць дэпутаты ў сваіх праграмах?

— Безумоўна, бо заўсёды праходзіць перадвыбарная кампанія. Людзі звяртаюць увагу на тое, што жадаюць зрабіць будучыя дэпутаты на тэрыторыі раёна. Усё напісана даступна — і выбаршчыкі гэта бачаць. Тут вельмі дапамагае наглядная агітацыя: фатаграфія дэпутата, біяграфія, можна наўпрост спытаць пра тыя ці іншыя пункты перадвыбарнай праграмы.

— Вы пазначылі праблемы раёна. А з якімі пытаннямі прыходзяць людзі?

— Кожны чалавек прыходзіць з пэўнай праблемай, і, вядома ж, спадзяецца, што мае рацыю і сапраўды можа разлічваць на дапамогу. А пытанні самыя розныя: рамонт дарог і вулічнага асвятлення, агароджванне могілак, спілоўванне дрэў, вызначэнне межаў зямельных участкаў, арганізацыя пляцовак для выпасу жывёлы... Па меры магчымасцяў пытанні вырашаюцца. Але ёсць моманты, калі мы адмаўляем, і гэтае рашэнне мае рацыянальную падставу.

— Што важней: інтарэсы людзей ці інтарэсы ўлады?

— Інтарэсы людзей і інтарэсы ўлады, тых жа дэпутатаў — гэта блізкія паняцці, таму што дэпутаты выходзяць з народу. Мы шчыльна кантактуем са сваімі грамадзянамі. Толькі сумесна выканаўчая ўлада і дэпутацкі корпус могуць знайсці пункты судакранання, якія ў выніку прыносяць карысць нашым грамадзянам. Мы выдатна разумеем, што калі ў нас у раёне зладжана працуюць усе структуры і прадпрыемствы, то людзі будуць спакойныя і задаволеныя. І мне здаецца, што жыхары раёна адчуваюць, што мы стараемся, наводзім парадак.

— Бліжэйшым часам у Дзяржынскім раёне плануецца правядзенне выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Удзельнікі мерапрыемства «праінспектуюць» уцягванне ў гаспадарчы абарот нявыкарыстанай маёмасці. Што будзеце паказваць?

— Мы плануем паказаць аб'екты, якія раней не выкарыстоўваліся, а потым былі прададзеныя прыватным арганізацыям. Напрыклад, у нас ёсць прадпрыемства па выпуску лакафарбавых вырабаў — у свой час набылі будынак, зрабілі рамонт і цяпер спакойна працуюць. Больш за тое, раён атрымаў новыя працоўныя месцы, грамадзянам плацяць зарплаты, у іх ёсць поўны сацыяльны пакет. Ёсць прадпрыемства, якое займаецца выпускам сельскагаспадарчай прадукцыі. Новыя ўладальнікі ўсё аднавілі, мадэрнізавалі. Будынкі засталіся, але вонкавы выгляд стаў значна лепшы... Усяго будынкаў, якія не выкарыстоўваюцца, па раёне не вельмі шмат: мы ж знаходзімся каля сталіцы, таму фірмам выгадна размяшчаць вытворчасць недалёка ад Мінска. Так што я лічу — паступова такая маёмасць будзе распрададзена.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.
lukashevich@zviazda.by

ПРЫЕМНАЯ НАВІНА

Інфраструктура — ад дзяржавы, садок — ад прыватніка

Днямі ў вёсцы Копішча Мінскага раёна адкрыўся новы дзіцячы сад. Гэта яшчэ адзін прыклад плённага дзяржаўнага і прыватнага партнёрства. Установа пабудавана за кошт таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сі-трэйдынг». На дадзены момант кампанія з'яўляецца забудоўшчыкам жылога комплексу «Уручскі». Інвестар затраціў на ўзвядзенне сада 7,1 млн рублёў, яшчэ 66 тыс. рублёў — на набыццё гульнявога абсталявання.

Сад разлічаны на 12 груп, у тым ліку і лагапедычных. Наведваць іх будуць 230 дзяцей. Тут створаны добрыя ўмовы для таго, каб малыя развіваліся як фізічна, так і духоўна, спасцігалі новыя веды. Да іх паслуг басейн, аснашчаны ўсім неабходным блок харчавання, трэнажорная, фізкультурная і музыкальная залы, рэсурсныя цэнтры ў кожнай узроставай групе, метадычны кабінет. Прадугледжаны асобныя кабінеты для педагогаў: дэфектолага, псіхолага.

Гэтага дзіцячага сада з нецярпеннем чакалі бацькі маленькіх дзяцей вёскі Копішча. Справа ў тым, што ў вёсцы, якая практычна злілася са сталіцай, вядзецца актыўнае будаўніцтва жылля, пражывае шмат маладых сем'яў.

Наяўнасць неабходнай інфраструктуры дазволіла мінімізаваць затраты. Гэта не першы прыклад супрацоўніцтва дзяржавы і прыватнага інвестара ў сталічнай вобласці. Літаральна месяц таму новая дашкольная ўстанова прыняла малых у вёсцы Прылукі Мінскага раёна.

За апошнія два гады Мінскі раён прырос на 3,5 тыс. дзяцей да 6 гадоў і працягвае гэту дынаміку.

У цэнтральным рэгіёне вядзецца будаўніцтва яшчэ дзвюх дашкольных дзіцячых устаноў — кожная на 230 малых наведвальнікаў — у горадзе Жодзіне і Стаўбцоўскім раёне.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» сообщает, что 3 мая 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 состоится повторный аукцион по продаже имущества частного сервисного унитарного предприятия «ГродноЛизинг»:

- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-4078 общей площадью 1407,7 кв. м, расположенного по адресу: г. Гродно, **ул. Ткацкая, д. 30**.

Начальная цена продажи: **649 000 рублей,** сумма задатка – **38 000 рублей.**
Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. №57, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00 **по 28 апреля 2017 года.**
Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546, 720537.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**
УНП 590727594

УНП 600068480

СООБЩЕНИЕ

о проведении закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции дополнительного выпуска ОАО «Рапс»

Открытое акционерное общество «Рапс» доводит до сведения акционеров, что 17 апреля 2017 года состоялось внеочередное общее собрание акционеров, на котором принято решение об увеличении уставного фонда ОАО «Рапс» на сумму денежного вклада, вносимого акционером общества – Минским районным исполнительным комитетом, путем выпуска дополнительных акций и утверждении условий проведения закрытой подписки на дополнительные акции.

В собрании приняли участие акционеры, обладающие в совокупности 2 072 831 голосом, или 55,2% от общего количества голосов, имеющих право на участие в собрании.

Внеочередное общее собрание акционеров приняло решение:

произвести увеличение уставного фонда ОАО «Рапс» до 11 357 397,00 (одиннадцать миллионов триста пятьдесят семь тысяч триста девяносто семь белорусских рублей 00 копеек) за счет внесения денежного вклада (денежных средств) Минским районным исполнительным комитетом в размере 46 814,07 (сорок шесть тысяч восемьсот четырнадцать белорусских рублей 07 копеек) путем выпуска простых (обыкновенных) акций и выпустить дополнительные акции путем проведения закрытой подписки с Минским районным исполнительным комитетом;

утвердить прилагаемые условия проведения закрытой подписки на дополнительные акции ОАО «Рапс» (приложение 1).

Приложение № 1:

1. Условия проведения закрытой подписки на дополнительные акции ОАО «Рапс» (далее – Условия) разработаны в соответствии с законодательством Республики Беларусь, уставом ОАО «Рапс» и определяют цели, порядок и сроки проведения закрытой подписки на дополнительные акции ОАО «Рапс» за счет внесения денежного вклада (денежных средств) Минским районным исполнительным комитетом в размере 46 814,07 (сорок шесть тысяч восемьсот четырнадцать белорусских рублей 07 копеек).

2. Цель подписки: пополнение оборотных средств ОАО «Рапс» и (или) осуществление расчетов с поставщиками.

3. Зарегистрированный уставный фонд составляет 11 310 582,00 (одиннадцать миллионов триста десять тысяч пятьсот восемьдесят два белорусских рубля 00 копеек), разделен на 3 754 574 простых (обыкновенных) акций и 15 620 привилегированных акций номинальной стоимостью 3,00 рубля каждая. Акции выпускаются в форме записей на счетах.

4. Размер объявленного уставного фонда составляет 11 357 397,00 (одиннадцать миллионов триста пятьдесят семь тысяч триста девяносто семь белорусских рублей 00 копеек).

5. Планируемый объем эмиссии:

5.1. сумма денежного вклада (денежных средств) составляет 46 814,07 (сорок шесть тысяч восемьсот четырнадцать белорусских рублей 07 копеек);

5.2. планируемый объем дополнительной эмиссии – 15 605 (пятнадцать тысяч шестьсот пять) простых (обыкновенных) акций номинальной стоимостью 3,00 (три белорусских рубля 00 копеек) каждая на общую сумму 46 815,00 (сорок шесть тысяч восемьсот пятнадцать белорусских рублей 00 копеек). Привилегированные акции при проведении данной подписки не размещаются. Цена подписки на одну акцию – 3,00 (три белорусских рубля 00 копеек);

5.3. разница в размере 0,93 (ноль белорусских рублей 93 копейки) между суммой увеличения уставного фонда и размером вносимого денежного вклада (денежных средств) в уставный фонд, образовавшаяся в результате некратности размера вносимого денежного вклада (денежных средств) номинальной стоимости акции, оплачивается из собственных средств ОАО «Рапс»;

5.4. оплата акций дополнительного выпуска производится путем перечисления денежного вклада (денежных средств) в размере 46 814,07 (сорок шесть тысяч восемьсот четырнадцать белорусских рублей 07 копеек) на расчетный счет ОАО «Рапс» р/с 3012201430128 в филиале ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление, код 942, г. Минск, пр-т Победителей, 91, 220020, г. Минск, МФО 153001942, УНН 6000 68 480, ОКПО 148 021 57;

5.5. выпуск дополнительных акций будет осуществлен в виде записей на счетах.

6. Место, время и период проведения закрытой подписки на акции (заключения договора):

6.1. срок проведения подписки составляет 15 календарных дней. Подписка проводится с 18 апреля 2017 по 2 мая 2017 года включительно;

6.2. место проведения подписки: Республики Беларусь, Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, время подписки: с 8.00 до 12.00 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни.

7. Иные существенные условия сделки определяются договором подписки на акции в соответствии с законодательством.

8. Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям ОАО «Рапс» определен уставом в соответствии с законодательством Республики Беларусь. ОАО «Рапс» вправе распределять между акционерами часть прибыли, остающейся в его распоряжении после уплаты налогов и иных обязательных платежей и покрытия убытков текущих периодов, посредством выплаты дивидендов. Дивиденды выплачиваются только по размещенным акциям.

Дивиденды выплачиваются по итогам года. Срок выплаты дивидендов устанавливается решением общего собрания акционеров, принятым большинством не менее двух третей от числа голосов лиц, принявших участие в этом собрании.

Размер дивиденда объявляется в белорусских рублях на одну акцию. Дивиденды выплачиваются в денежных единицах Республики Беларусь, а по решению общего собрания акционеров и с согласия их получателей – в установленном порядке товаром, ценными бумагами или иным имуществом. Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составляется на основании данных того же реестра владельцев ценных бумаг, на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, принявшем решение о выплате соответствующих дивидендов.

Информация о времени и месте выплаты дивидендов доводится до сведения акционеров в том же порядке, в котором они извещаются о проведении общего собрания акционеров. По заявлению акционера причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в банке. Расходы по пересылке (перечислению) дивидендов в пределах Республики Беларусь производятся за счет средств ОАО «Рапс». Дивиденды на принадлежащие государству акции перечисляются в соответствующий бюджет в 10-дневный срок с объявления даты их выплаты, если собственником имущества или уполномоченным лицом не принято иное решение по их использованию. При этом перечисление дивидендов на принадлежащие государству акции должно быть осуществлено не позднее 1 мая года, следующего за отчетным.

ОАО «Рапс» не вправе принимать решения об объявлении и выплате дивидендов, а также выплачивать дивиденды, если:

уставный фонд оплачен не полностью;

стоимость чистых активов общества меньше суммы его уставного фонда и резервных фондов либо станет меньше их суммы в результате выплаты дивидендов;

общество имеет устойчивый характер неплатежеспособности в соответствии с законодательством об экономической несостоятельности (банкротстве) или если указанный характер появится у общества в результате выплаты дивидендов;

не завершен выкуп акций общества по требованию его акционеров.

9. Количество размещаемых по подписке акций не должно превышать объема эмиссии, указанного в подпункте 5.2. пункта 5 настоящих условий. В случае если объем эмиссии в ходе подписки достигнут, подписка прекращается досрочно. В случае недостижения планируемого объема эмиссии подписка признается несостоявшейся.

10. Если в установленный срок Минский районный исполнительный комитет не исполнил (ненадлежащим образом исполнил) обязательства по оплате акций, определенные договором подписки, признается, что Минский районный исполнительный комитет отказался от приобретения акций. В случае отказа от приобретения акций заключенный договор подписки считается расторгнутым.

11. Закрытая подписка признается несостоявшейся, если планируемый объем эмиссии не достигнут в период ее проведения или отсутствует заключенный договор подписки на дату окончания подписки.

12. В случае принятия общим собранием акционеров решения об отказе от выпуска акций или признания закрытой подписки несостоявшейся ОАО «Рапс» возвращает Минскому районному исполнительному комитету денежный вклад (денежные средства), внесенный(ые) им в ходе подписки, не позднее 1 месяца с даты проведения общего собрания акционеров, на котором будут утверждены результаты проведения закрытой подписки.

13. Результаты проведения закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции ОАО «Рапс» дополнительного выпуска утверждаются решением общего собрания акционеров ОАО «Рапс» в двухмесячный срок с даты окончания проведения закрытой подписки.

14. Директору ОАО «Рапс» Ломако М. С. заключить в установленном законодательством порядке договор подписки на акции ОАО «Рапс», выпускаемые на сумму вносимого денежного вклада (денежных средств) и довести до сведения акционеров ОАО «Рапс» решение о проведении закрытой подписки на акции дополнительного выпуска, опубликовав сообщение в газете «Звязда».

АД СПАДАРОЖНІКА ДА «МАЛЫША» І «САШАЧКІ»

Прамысловы гігант савецкай эпохі, знакаміты «Інтэграл» паспяхова ўпісаўся ў сучасны рынак. Сёння ён прадстаўляе сабой комплекс прадпрыемстваў і КБ, што забяспечваюць поўны цыкл стварэння вырабаў — ад праектавання да серыйнай вытворчасці. Гэта адзін з найбуйнейшых вытворцаў інтэгральных мікрасхем, дыскрэтных паўправадніковых прыбораў, сродкаў адлюстравання інфармацыі, вырабаў электроннай і медыцынскай тэхнікі ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі.

Сярод лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2016 года ў галіне навукі і тэхнікі — генеральны дырэктар ААТ «Інтэграл» Віталь Саладуха і кіраўнік філіяла аб'яднання — «НТЦ «Белмікрасістэмы» Сяргей Шведаў. З Віталем Аляксандравічам САЛАДУХАМ сустрэліся карэспандэнты «Звязды».

— Чарговы раз Дзяржаўная прэмія прысуджаецца прадстаўнікам «Інтэграла» — за распрацоўку і арганізацыю прамысловай вытворчасці мікраэлектронных вырабаў двайнога і спецыяльнага прызначэння. Як вы лічыце, Віталь Аляксандравіч, у чым прычына такой паспяховай працы калектыву?

— Думаю, адказ ляжыць на паверхні — у цеснай сувязі з навукай. І пачыналася ўсё з таго, што з моманту стварэння «Інтэграла», паколькі галіна, у якой ён працуе, дастаткова складаная, адразу была арганізавана падрыхтоўка профільных спецыялістаў — у БДУ, у мінскім радыётэхнічным інстытуце і іншых ВНУ. І наладжана цеснае ўзаемадзеянне з іх навукай і з Нацыянальнай акадэміяй навук. Бо для вытворчасці мікрасхем, каб атрымаць на выхадзе сучасную якасную прадукцыю, трэба праводзіць вельмі вялікі спектр навуковых даследаванняў. Я на «Інтэграле» з 1982 года, і ўжо ў той перыяд навукоўцы хадзілі да нас кожны дзень як на працу. І кантакты з цягам часу толькі ўмацоўваліся. А гэта важна хоць бы таму, што ў мікраэлектроніцы выкарыстоўваецца дастаткова складанае аналітычнае абсталяванне, і распрацаваць усе методыкі тут, унутры «Інтэграла», даволі складана, можа не хапіць рэсурсаў. У савецкі час у Беларусі працавала адразу некалькі фізічных інстытутаў, зараз яны сабраны ў аб'яднаным інстытуце фізікі. І ўзаемадзейнічаць мы менш не сталі, як і з інстытутамі хімічнага профілю. Пра што сведчаць шматлікія сумесныя распрацоўкі.

Больш таго, нядаўна падпісана пагадненне аб стварэнні інавацыйнага профільнага кластара, куды ўвайшлі як БДУ, БДУІР, БНТУ, як Нацыянальная акадэмія навук — у прыватнасці, інстытут агульнай фізікі, — так і прамысловыя прадпрыемствы — «Планар» і «Інтэграл», а таксама НДІ радыёматэрыялаў. Мэта — дабіцца яшчэ большай узгодненасці сумеснага пошуку.

> «На расійскіх касмічных караблях і ваенных самалётах стаяць і безадказна працуюць інтэгралаўскія мікрасхемы».

Варта мець на ўвазе, што даследаванні ў галіне мікраэлектронікі вядуцца на вельмі дарагім абсталяванні, якое патрабуе і складанай інжынернай інфраструктуры. Расходныя матэрыялы таксама дарагія, а яшчэ неабходны так званыя чыстыя газы і асабліва чыстыя памяшканні. І калі браць звычайны акадэмічны інстытут, то многае з гэтага трэба ствараць. А ў нас на «Інтэграле» ўсё ёсць: чыстыя, фактычна стэрыльныя памяшканні, чыстыя газы, азотна-кіслародная і вадародна-кіслародная станцыі і гэтак далей. Летась у канцы года прайшла нарада пад старшынствам кіраўніка Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра Рыгоравіча Гусакова, на якой дамовіліся ў дэталях аб стварэнні цэнтра калектыўнага карыстання, падборы абсталявання. Прадугледжана, што кожны выконвае па ўзгодненым плане сваю частку работы, а разам выкарыстоўваем атрыманы вынік.

На працягу сваёй гісторыі мы былі вытворчым аб'яднаннем, потым вытворча-тэхнічным аб'яднаннем, далей — навукова-вытворчым. І заўсёды займаліся навукай. З самага пачатку за прыкладныя даследаванні на «Інтэграле» адказвала і адказвае СКТБ, цяпер гэта — наш філіял НТЦ «Белмікрасістэмы», інакш дызайн-цэнтр. У склад яго ўваходзіць сертыфікаваны цэнтр «Белмікрааналіз», які праводзіць даследаванні фізічных, хімічных і іншых характарыстык і наогул выконвае шмат карыснай работы.

Прадуктыўна супрацоўнічаем не толькі са сталічнымі ВНУ, але і ўніверсітэтамі Гомеля. Іх выпускнікі ахвотна прыходзяць да нас на працу яшчэ і таму, што выдзяляем інтэрнат, а кантракт заключаем не на два, а на пяць гадоў. Калі чалавек адпрацаваў пяць гадоў, ён становіцца спецыялістам у нашай складанай прафесіі, у яго з'яўляецца больш моцная матывацыя да працы, і юнакі застаюцца працаваць.

— Бо пачынаюць адчуваць сябе сталымі членамі калектыву, ганарацца яго справамі?

Прадстаўляем суразмоўцу

Родам Віталь Аляксандравіч з вёскі Хатляны Уздзенскага раёна. Выпускнік БДУ, скончыў факультэт радыёфізікі і электронікі. Кандыдат тэхнічных навук.

Працоўная біяграфія цалкам звязана з аб'яднаннем «Інтэграл», куды малады камандзір узвода прыйшоў пасля тэрміновай службы ў арміі. Пачынаў інжынерам на СКТБ. На заводзе «Транзістар», што ўваходзіць у аб'яднанне, быў намеснікам начальніка цэха па тэхналогіі, а пасля рэарганізацыі — галоўным інжынерам і дырэктарам завода.

З 2009 года генеральны дырэктар ААТ «Інтэграл».

— Згадзіцеся: каб калектыў ганарыўся сваім прадпрыемствам, чалавек павінен атрымліваць дастойную зарплату. Постсавецкі перыяд, у сярэдзіне 90-х, выдаўся надзвычай складаным для нас, але перажылі, захавалі калектыў і найважнейшыя пазіцыі. Сёння зарплата вышэйшая за сяроднерэспубліканскі паказчык. Таму і моладзь ідзе на прадпрыемства ахвотна, у нас больш за 30 працэнтаў членаў калектыву — людзі ва ўзросце да 35 гадоў. І важна, што яны добра працуюць, па-наватарску.

Але вернемся да размовы пра навуковы складальнік нашага вытворчага жыцця, пра новыя распрацоўкі, а гэта працэс бесперапынны. Існуюць навукова-тэхнічныя праграмы, у рамках якіх вядуцца распрацоўкі. Ёсць праграмы Саюзнай дзяржавы, так што навуковы пошук і пастаноўка прадукцыі на вытворчасць ідуць пастаянна. У нас існуе ўліковы паказчык «Доля інавацыйнай прадукцыі ў аб'ёме вытворчасці». Па факце атрымліваецца, што ў нас яе больш за 30 працэнтаў, а гэта добрая лічба, якая сведчыць: пастаянна вядзецца абнаўленне.

— Нядаўна краіна адсвяткавала Дзень касманаўтыкі. У свой час аб'яднанне атрымала ордэн Леніна і ордэн Кастрычніцкай рэвалюцыі за распрацоўку і стварэнне апаратуры для даследавання касмічнай прасторы. Работа на космас працягваецца?

— Ва Указе кіраўніка дзяржавы аб прысуджэнні прэмій не выпадкова гаворыцца пра экспартную арыентаванасць нашай прадукцыі. Пераважная яе большасць пастаўляецца на знешнія рынкі, і перш за ўсё на рынак Расійскай Федэрацыі. У тым ліку для яе абаронна-прамысловага комплексу і для выканання касмічных праграм. На расійскіх касмічных караблях і ваенных самалётах стаяць і спраўна працуюць інтэгралаўскія мікрасхемы.

Можна ўспомніць, што мы актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні першага беларускага міні-спадарожніка дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. І гэтая работа, вядома, працягваецца. Зараз удзельнічаем адразу ў некалькіх праграмах Саюзнай дзяржавы, дзве з якіх напрамую звязаны з касмічнай тэматыкай.

Калі далей развіваць тэму экспарту, то пастаўляем таксама прадукцыю ў Паўднёва-Усходнюю Азію — даволі патрабавальным спажыўцам Кітая, Паўднёвай Карэі, Тайваня, Ганконга. Я не прыводзіў бы такі вось прыклад, але ён надзвычай яскравы: з адным са сваіх спажыўцоў супрацоўнічаем 25 гадоў — адпраўляем яму бяскорпусныя крышталі ў складзе пласцін, ён збірае іх і пастаўляе знакамітай карэйскай фірме LG. У халадзільніках і іншай складанай бытавой тэхніцы любімай нашымі гаспадынямі маркі LG, дзе ёсць электроніка, стаяць нашы камплектуючыя.

Высокі ўзровень якасці прадукцыі дазволіў развіваць супрацоўніцтва з Індыяй, ЮАР, шэрагам іншых краін і выйсці на еўрапейскі рынак, што ганарова.

Праўда, пры ўсім пры тым летась у нас засталася недавыкананай задача па экспарце, што напрамую звязана з інфляцыяй расійскага рубля. Экспарт разлічваецца ў доларах, і «прасяданне» расійскай грашовай адзінкі дало сябе адчуць. Зараз, калі рубель пачаў умацоўваць пазіцыі, у нас тэмп росту экспарту ў першым квартале 2017 года — 123 працэнты.

— На чым засяродзіў сваю ўвагу калектыў сёння?

— Па-ранейшаму на забеспячэнні высокай якасці прадукцыі і своечасовым выкананні заявак спажыўца. Наш асноўны прынцып — быць надзейным партнёрам для спажыўцоў і ўзорным пастаўшчыком высакаякаснай прадукцыі. Для чаго трымаем пэўны запас гатовай прадукцыі, каб заяўкі задавальняць аператыўна. Бо вытворчы цыкл працяглы, для вытворчасці, скажам, адной мікрасхемы трэба выканаць ад 300 да 800 тэхналагічных аперацый — у залежнасці ад складанасці. Спажывец не можа так доўга чакаць.

> «На працягу сваёй гісторыі мы былі вытворчым аб'яднаннем, потым вытворча-тэхнічным аб'яднаннем, далей — навукова-вытворчым. І заўсёды займаліся навукай».

А высокая якасць патрэбна таму, што вырабы шырока прымяняюцца пры стварэнні высокадакладных устройстваў для работы ва ўмовах уздзеяння электрамагнітных палёў, у атамнай энергетыцы, у той жа касмічнай тэхніцы. Цікавы штрых: кваліфікацыйныя выпрабаванні мікрасхем доследнай партыі (на безадмоўнасць) перад пастаноўкай на вытворчасць працягваюцца ад 3 да 4,5 тысячы гадзін. Гэта значыць, да дзевяці месяцаў. У выніку ўся прадукцыя абаронена выпрабаваннямі.

Мы не супакоіліся на тым, што наша сістэма кіравання якасцю найважнейшых відаў прадукцыі сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням строгіх міжнародных стандартаў, а сістэма кіравання навакольным асяроддзем — на адпаведнасць патрабаванням міжнароднага экалагічнага стандарту. Зыходзім з таго, што адпаведнасць трэба пацвярджаць, а над якаснымі параметрамі працаваць пастаянна.

— Гэта значыць, узровень ведаў выканаўцы ўздымаць да ўзроўню падрыхтоўкі інжынера?

— Не паверыце, але нават па адзіным тарыфна-кваліфікацыйным даведніку веды ў нашага рабочага павінны быць на ўзроўні інжынера. У нас вялікі калектыў, і 51 працэнт работнікаў маюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю. Астатнія самастойна, у працэсе работы, даводзяць узровень сваіх ведаў да патрэбнага ўзроўню. Калектыў моцны, прафесійна падрыхтаваны, свае задачы разумее і ведае, як з імі справіцца. Я ўжо казаў, якую колькасць аперацый трэба выканаць для вытворчасці крышталіка мікрасхемы. І кожную аперацыю выконваюць розныя людзі. Памылка аднаго на фінішы можа звесці на нуль працу ўсіх. Вось чаму ў нас вельмі высокія патрабаванні да вытворчай, тэхналагічнай дысцыпліны. І гэта перадумова поспеху.

Не менш адказна ставімся да банкаўскага і касавага абсталявання, магнітных картак, прыстасаванняў камп'ютарнай памяці, даволі шырокага спектра медыцынскай тэхнікі, якую выпускаем. Электрамеханічныя бальнічныя ложкі з антыпролежневымі матрацамі, неанатальнае абсталяванне «Малышка», функцыянальны ложачак для нованароджаных «Сашачка» і іншая наша прадукцыя зроблены сумленна. Магу засведчыць: немаўлятам падабаецца. Мамам і татам — таксама.

1. За шклом — памяшканне, у якім тэхналогія патрабуе кантраляванага мікраклімату і звышчыстага паветра.

2. Аўтаматычны электронны дазатар «ДЭА-100» і медыцынскі манітор «Інтэграл-12» — прыклады распрацовак для ўстаноў аховы здароўя.

3. У выставачнай зале побач з макетам касмічнага карабля можна ўбачыць узоры мікрасхем, дзякуючы якім дзейнічае складанае аэракасмічнае абсталяванне.

Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

АД РЭДАКЦЫІ. Творчая брыгада шчыра дзякуе намесніку генеральнага дырэктара Міхалаю Міхайлавічу Тарасевічу, начальніку ўпраўлення персаналу таварыства Уладзіміру Уладзіміравічу Глухманчуку і намесніку дырэктара НТЦ «Белмікрасістэмы» члену-карэспандэнту НАН Беларусі Анатолю Іванавічу Белавусу за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.

УНП 100386629

АБМЯРКУЕМ

БЫЛА ШКОЛА — СТАЛА КРАМА

Не кожны дом пераходзіць у спадчыну... Што ўжо казаць пра будынкі былых установ і арганізацый, якія таксама губляюць наведвальнікаў і застаюцца без догляду. Тым не менш дазволіць маёмасці зарастаць пустазеллем таксама нельга. Мы пацікавіліся, як складваецца лёс падобных аб'ектаў у розных рэгіёнах краіны.

Старшыня Багушэвіцкага сельскага Савета дэпутатаў Бярэзінскага раёна Ларыса БАБІНОВІЧ расказала, што прыватных пустых будынкаў на іх тэрыторыі даволі мала: людзей прывабліве размяшчэнне жытла непадалёк ад Бярэзіны. Што датычыцца грамадскіх пабудоў, то ў 2015 годзе была закрыта Чыжахская сярэдняя школа — дзіцячы сад. Школьнікі сталі ездзіць на вучобу ў суседнюю вёску, а памяшканні былой навучальнай установы прадалі з аўкцыёну. Цяпер новы ўласнік — расійская фірма — пераабсталёўвае будынак пад вытворчасць кармоў для жывёл.

Яшчэ адну школу, што засталася незапатрабаванай, аддзел адукацыі таксама збіраецца прадаць.

— Калі будынак будзе рэалізаваны няхай нават за адну базавую велічыню, усё роўна нашай мясцовасці гэта пойдзе на карысць, — упэўнена Ларыса Бабіновіч. — Каб набыць памяшканне за мінімальны кошт, патэнцыйны пакупнік павінен мець бізнес-план і быць гатовым наймаць на будучае прадпрыемства мясцовых жыхароў, ствараць новыя працоўныя месцы.

На раённых нарадах абмяркоўваецца і лёс дзвюх жывёлагадоўчых фермаў. Ліквідацыю будынкаў праводзіць мясцовае ААТ, ужо накіраваны запыт на праект па зносе.

— Памяшканні ў напаўразбураным стане, выкарыстоўваць іх далей немагчыма. У праекце будзе прапісана, якім чынам утылізуецца пабудова, што з другасных матэрыялаў потым можна будзе выкарыстаць яшчэ раз. Вядома, многа што залежыць ад наяўнасці сродкаў, але справа рухаецца. Хутчэй за ўсё, тэрыторыя потым будзе засеяна ці выкарыстана для выгану жывёлы.

— У нас ёсць 28 незапатрабаваных адміністрацыйных пабудоў, — адразу пачынае з лічбы **старшыня Капыльскага сельскага Савета дэпутатаў Вольга КУПРЫЯНКА**. — Даволі шмат устаноў раней належалі жыллёва-камунальнай гаспадарцы, ёсць будынак раённага спажывецкага таварыства, некалькі клубаў... Дарэчы, у 2014 годзе мы падавалі заяву ў агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, каб знайсці ўласніка згаданых клубаў. Сёлета ў ліпені якраз скончыцца тэрмін пошуку, і калі гаспадар так і не адгукнецца, будынкі выставім на продаж.

Як адзначыла старшыня, не для ўсіх памяшканняў удаецца знайсці новых уласнікаў. Некаторыя будынкі маюць маленькі астаткавы кошт ці патрабуюць грунтоўнага рамонту. У такім выпадку іх зносяць. Пасля, калі пляцоўка знаходзіцца ў жылым раёне, яе можна набыць для будаўніцтва. Незапатрабаваныя землі ўключаюцца ў севазварот.

Старшыня Камунараўскага сельскага Савета дэпутатаў Любанскага раёна Мікалай ДУДЗІК кажа, што з аддаленнем ад горада змяншаецца і зацікаўленасць пакупнікоў у буйной маёмасці:

— Ад нас да Любані каля 25 кіламетраў, паблізу няма значных аўтамабільных дарог, чыгункі. Вялікіх прадпрыемстваў таксама на тэрыторыі не пабудавана. Выходзіць, што прыдатнай для гаспадарчых патрэб зямлі многа, а попыту на яе мала. Таму частку старых будынкаў зносім як незапатрабаваныя. У той жа час ёсць практыка здаваць памяшканні былых адміністрацыйных устаноў у арэнду. Напрыклад, дом у вёсцы Камуна, дзе раней размяшчаўся сельвыканкам, стаў філіялам пошты. Таксама быў выпадак, калі будынак сельскай амбулаторыі выкупіў прадпрымальнік і арганізаваў там магазін. Яшчэ адзін прыклад — школа ў вёсцы Нежын. Пасля аптымізацыі, калі дзеці сталі ездзіць на вучобу ў іншы населены пункт, памяшканні тры гады стаяць пустымі. Ёсць вартаўнік, які даглядае маёмасць. Будынак яшчэ прыдатны для выкарыстання: раней школа была цёплай, утульнай, са спортзалай і сталовай. Ды і размяшчэнне выгаднае — у цэнтры пасёлка. Будзем спадзявацца, што ёй яшчэ зацікавяцца дзелавыя людзі.

Старшыня Войскага сельскага Савета дэпутатаў Камянецкага раёна Віктар МІХАЙЛОЎСКІ ў якасці прыкладу ўдалага продажу праблемнага памяшкання прывёў гісторыю мікалаеўскага клуба. Будынак, дзе раней збіралася моладзь і размяшчалася сельская бібліятэка, прыйшоў у заняпад. Пачаў цячы дах, ды і наведвальнікаў стала вілася ўсё менш... Устаноў закрылі, а сам будынак прастаяў каля двух гадоў, пакуль збіралася неабходная дакументацыя для яго продажу праз аўкцыён.

— Новы гаспадар — прадпрымальнік з Брэста — наводзіць парадак і рыхтуецца ў вызначаны тэрмін увесці памяшканне ў эксплуатацыю. Падобная гісторыя адбылася таксама з камбікормавым заводам прыкладна чатыры гады таму. Сельскагаспадарчае прадпрыемства прадало пусты будынак іншаму ўласніку. Пасля сур'ёзнай рэканструкцыі там наладжана вытворчасць алею з рапсу.

Сярод пустуючых аб'ектаў **старшыня Капцэвіцкага сельскага Савета дэпутатаў Петрыкаўскага раёна Наталля СУПРУНОВІЧ** асабліва выдзеліла былы завод для сушкі агародніны. Раней гэта было вялікае прадпрыемства, якое забяспечвала працай мясцовых жыхароў. Цяпер жа яго тэрыторыя абнесена агароджай, а ліквідацыйная камісія шукае для будынкаў новага ўласніка.

— Былы ўласнік вырашыў закрыць прадпрыемства, бо патрабавалася грунтоўная мадэрнізацыя і замена абсталявання, — тлумачыць **начальнік аддзела эканомікі Петрыкаўскага райвыканкама Алена ЛЯВОНЧЫК**. — І ў снежні 2009 года завод трапіў пад увагу ліквідацыйнай камісіі. Некалькі будынкаў былі прададзены фермерскай гаспадарцы, астатнія зачынены і выстаўляюцца на таргі. На жаль, пакупнікоў няшмат, хоць кошт зніжаны да мінімальнага. Але можна спадзявацца, што памяшканні яшчэ будуць карыснымі. Напрыклад, у раёне будуецца горна-абагачальны камбінат, і, магчыма, плошчы былога завода таксама будуць задзейнічаны.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ
УСП «ПРИОРЛАЙФ» ПРИОРБАНК ОАО
ЗА 2016 ГОД

Адрес: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31а, УНП 806000018
Тел./факс: 2899255, 2899256
Вид деятельности: страхование жизни

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01.01.2017 г.

руб.

АКТИВЫ	Код строки	На 1 января 2017 года	На 31 декабря 2015 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	21 061	4 394
Нематериальные активы	120	448 823	293 120
Вложения в долгосрочные активы	140	14 833	
Долгосрочная дебиторская задолженность	160	1 043 463	762 314
Отложенные налоговые активы	170		
Прочие долгосрочные активы	180	2 773	3 529 872
ИТОГО по разделу I	**190**	**1 530 953**	**4 589 700**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	5 185	2 883
в том числе: материалы	211	5 185	2 883
Расходы будущих периодов	220	6 755 738	
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	230	5 718	
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	324 309	158 022
Краткосрочные финансовые вложения	260	2 030 990	
Денежные средства и их эквиваленты	270	36 256 859	19 746 565
в том числе: депозитные счета	272	35 550 254	19 462 409
прочие денежные средства	274	706 605	284 156
